ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарывым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 80 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТ
За радок непр. пасьля тэксту іншагародніх абвестак—1 р. За паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьніж тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. задагну.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СУБОТА, 18 кастрычніка 1930 г.
№ 244 (3842)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

НАУЧНАЯ БИБЛИОТЕКА
Москва, Б-ко ЦИК СССР
Отд. стуж. сыст.

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА

УДАРНА СКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ МЯСНЫХ ФАБРЫК

Вайна апартуністычнай недаацэнцы праблемы жывёлагадоўлі

МЕНСК, 18 кастрычніка

XVI партыйны зьезд вызначыў пэўныя шляхі далейшага разьвіцьця жывёлагадоўлі і вырашэньня мясной праблемы ў нашай краіне. Шлях гэты адзіны — «арганізацыя спэцыяльных жывёлагадоўчых саўгасаў, аналёгічна збожжавым і масавае стварэньне высока таварных калгасных фэрм».

На фронце барацьбы за сацыялістычную жывёлагадоўлю мы ўжо маем значныя посьпехі. Стада «Скатавода» па СССР ужо даведзена да 600.000 галоў, а стада «Сьвінаводу» да 85.000 галоў.

У галіне разьвіцьця сьвінагадоўлі па БССР ускладзена вельмі адказная задача — даць краіне ў 1931 годзе 250.000 таварных падсьвінкаў. Выкананьне гэтага заданьня патрабуе напружанай энэргічнай работы як калектываў савецкіх гаспадарак, так і загатоўчых арганізацый і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці і вёскі.

Тыдзень таму назад мы ўжо адзначалі, што будаўніцтва сьвіных гаспадарак у саўгасах «Сьвінаводу» знаходзіцца пад пагрозай. Некаторыя цэнтральныя і мясныя арганізацыі недаацэньваюць значэньня будаўніцтва сьвінпрамгасаў. На 10 кастрычніка плян укамплектаваньня саўгасаў «Сьвінаводу» выкананы толькі ў разьмеры 43 проц. Саўгасы «Сьвінаводу» не спраўляюцца прымаць сьвінаматак ад загатоўчых арганізацый. Карантынныя пункты перапоўнены сьвінаматкамі.

Для фарсаваньня будаўніцтва ў саўгасах «Сьвінаводу» Эканамічнай Нарадай БССР ужыта рад мерапрыемстваў: з 15 кастрычніка абвешчаны месячнік сьвінагадоўлі, на працягу якога павінна быць закончана будаўніцтва матачнікаў і ўкамплектаваньне саўгасаў сьвінаматкамі.

Наркампрацы БССР прапанавана **ў пяцідзённы тэрмін** забясьпечыць будаўніцтва патрэбнай тэхнічнай рабочай сілай (500 чал.). Наркамгандлю і Белкаапсаюзу прапанавана забясьпечыць прадуктамі і прамтаварамі рабочых, занятых на будаўніцтве. Белсельтрэсту калегія НК РСІ запрапанавала **ў двухдзённы тэрмін** прыняць з саўгасаў «Сьвінаводу» 1.500 цялят і гэтым аслабяць месца для сьвінаматак.

Учора мы праверылі, як рад цэнтральных установаў выконвае дырэктывы вышэйшага ўрадавага органу. Аказваецца, Наркампрацы толькі ўчора ўхвалілі выслаць людзей у раёны для вярбоўкі рабочых. Зразумела, калі Наркампрацы будзе выконваць дырэктывы ўраду такімі тэмпамі, дык будаўніцтва своячасова рабочай сілай забясьпечана ня будзе.

Але, калі Наркампрацы сёе-тое робіць, дык Белсельтрэст наогул ня выконвае дырэктывы ўраду. Што робіцца для таго, каб забраць цялят з саўгасаў? Нічога. Больш таго, у Белсельтрэсьце разважаюць так: «Мы ня можам гэтага выканаць, у нас ёсьць на тое свае падставы, аб якіх мы паведамім ураду. У нас ёсьць 20 дзён тэрміну, усьпеем разабрацца». Так, замест неадкладнага і безагаворачнага выкананьня катэгарычнай дырэктывы партыі і ўраду, Белсельтрэст імкнецца **адгразіцца ад урэзлу ў барацьбе за выкананьне плянаў сьвінагадоўлі**, спасылаючыся на розныя «аб'ектыўныя» прычыны. Такім тэндэнцыям ухіліцца ад выкананьня выразных дырэктыў партыі і ўраду трэба даць рашучы адпор.

Плян будаўніцтва сьвіных гаспадарак у БССР павінен быць на чым-бы ні стала выкананы. Саюзы Сельгаслесрабочых і будаўнікоў павінны мабілізаваць увагу грамадзкасьці саўгасаў і будаўнікоў вакол фарсаваньня будаўніцтва сьвінарнікаў і ўкамплектаваньня саўгасаў сьвінаматкамі. Цэнтральныя раённыя ўстановы ў сваю чаргу павінны ўсімі мерамі і сродкамі дапамагчы саўгасам выкапаць ускладзеную на іх задачу. Усякім спасыланьням на «аб'ектыўныя» прычыны не павінна быць месца.

Трэба з усёй выразнасьцю сказаць, што выкананьне праграмы жывёлагадоўлі — адна з важнейшых гаспадарча-палітычных задач усёй КП(б)Б, усёй пралетарскай грамадзкасьці. З недаацэнкай значэньня гэтага вучастку трэба весьці самую рашучую барацьбу. **Трэба бязьлітасна выкараняць найменшае праяўленьне ведамсьцьвеннай замкнутасьці, месьніцтва, апартуністычнай бязьдзейнасьці і самацёку.**

Агульнымі намаганьнямі мы павінны дабіцца і дабʼемся поўнага выкананьня плянаў будаўніцтва і камплектаваньня сьвінагадоўчых саўгасаў.

Абвешчаны месячнік сьвінагадоўлі павінен стаць сапраўды месячнікам барацьбы за баявыя тэмпы ў разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Ігнаруюць дырэктыву ўраду

Учора наш супрацоўнік наведаў **Наркампрацы і Белсельтрэст**, каб даведацца, што імі зроблена для выкананьня дырэктывы Экана і НК РСІ для забесьпячэньня будаўніцтва ў саўгасах «Сьвінаводу». Наркампрацы было прапанавана ў пяцідзённы тэрмін даць для будаўніцтва 500 рабочых і тэхнікаў, ня спыняючыся нават перад перакідваньнем рабочай сілы з менш важных пабудоў. Да сёнешняга дня Наркампрацы паслаў у раёны 22 тэхнічных работнікаў. Што датычыць рабочай сілы, дагэтуль яшчэ канкрэтнага нічога ня зроблена. Толькі ўчора Наркампрацы парашыў паслаць у раёны вербаваць рабочых.

Белсельтрэсту НК РСІ запрапанавана забраць цялят, якія знаходзяцца ў саўгасах «Сьвінаводу» і разьмясьціць іх у будынках былых кулацкіх гаспадарак. Замест таго, каб прыступіць да выкананьня пастановы, Белсельтрэст піша лісты ў СНК і НК РСІ з просьбай, каб скасаваць яе.

— Нам далі 20 дзён — кажа дырэктар Белсельтрэсту, управімся разабрацца.

Жывёлагадоўля —на задворках

У некаторых раёнах аддаецца вельмі мала ўвагі разьвіцьцю жывёлагадоўлі ў калгасах. Характэрным прыкладам гэтага можа быць **Койданаўскі раён.** У калгасе імя Мархлеўскага дагэтуль яшчэ ня прыступлена да пабудовы хлявоў і сьвінарніка. Замест вызначаных 100 галоў рагатай жывёлы, набыта толькі 85. Такое становішча і ў камуне **імя Сталіна.** Калгас імя **«9 студзеня»** загатовіў толькі 30 проц. патрэбных лесаматар'ялаў. Пабудова хлева ў ім яшчэ не распачата. **Крэдыт атрыманы на будаўніцтва, але скарыстаны не па прызначэньні.** Калгас **«Пралетары»** не распачаў будаўніцтва сьвінарніка. Калгасы **імя Крупскай і «Чырвоны Пагранічнік»** саравалі будаўніцтва птушніка і трусоўніка.

У Коханаўскім раёне з вызначаных плянам 6 сьвінарнікаў, распачаты будаўніцтвам толькі два — у калгасах «Волга» і «Новае жыцьцё», але і там яшчэ ня зроблены стрэхі і падлогі.

Рэшта калгасаў (Гаснана, «Чырвоная зорка» і «Рэспубліка») да будаўніцтва яшчэ ня прыступілі. Такія-жа факты мы маем і ў Капыльскім раёне.

Галоўнай прычынай таго, што ў многіх саўгасах будаўніцтва сьвіных гаспадарак і малочных фэрм знаходзіцца пад пагрозай, зьяўляецца нявыстарчальная ўвага да гэтай справы з боку раённых арганізацый. Мясцовыя партыйныя і камсамольскія арганізацыі не завастрылі ўвагу калгасьнікаў на своячасовым сканчэньні будаўніцтва і ўкамплектаваньні гаспадарак. Зараз, са сканчэньнем уборкі і сяўбы ў калгасах, вызваляюцца рабочыя рукі, якія трэба кінуць на будаўніцтва.

С. Б.

Копысь напередадзе

Плян адгрузкі перавыкананы

КОПЫСЬ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

ГАДАВЫ ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ НА 15-га КАСТРЫЧНІКА ВЫКАНАНЫ Ў РАЗЬМЕРЫ 104 ПРОЦ.

КАЛГАСЫ 1 САЎГАСЫ РАЁНУ СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ. ЦЭЛЫ РАД КАЛГАСАЎ СКОНЧЫЎ СЯЎБУ З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ. 13 КАЛГАСАЎ РАЁНУ СКОНЧЫЛІ ЎБОРКУ БУЛЬБЫ.

РАЙШТАБ.

Рабочыя „Дняпроўскай мануфактуры“ вышлі на ўборку

ДУБРОЎНА. У раёне праверка разьвівацца шпаркім тэмпам.

Адзінаасобнікі стварылі брыгаду дапамогі калгасам і саўгасам па ўборцы бульбы з 265 чал.

100 членаў саюзу будаўнікоў абвясьцілі слабе ўдарнікамі па ўборцы і выклікалі на спаборніцтва рабочых «Дняпроўскай мануфактуры». Дняпроўцы прынялі выклік—1.140 рабочых і у свой выхадны дзень вышлі ў саўгас

РАЙШТАБ.

Месячнік сьвінагадоўлі ў КАЛГАСАХ

Праўленьнем **Белкалгасцэнтру** разасланы ліст усім праўленьням калгасаў, райкалгасаюзам і райкалгасасэкцыям аб правядзеньні месячніка сьвінагадоўлі ў калгасах БССР. Асноўнымі задачамі месячніка зьяўляюцца: хутчэйшае сканчэньне будаўніцтва сьвінарнікаў у сьвінагадоўчых калгасах і ўкамплектаваньне іх сьвінаматкамі, арганізацыя ў рэштцы калгасаў таварнага абагуленага сьвінога стада і разгортваньне сапраўднай барацьбы з эпізоатыяй.

Праўленьне Белкалгасцэнтру абавязала праўленьні ўсіх калгасаў і раённых калгассаюзаў арганізаваць у калгасах камісіі садзейнасьці сьвінагадоўлі, праверыць выкананьне будаўніцтва сьвінарнікаў. На працягу месячніка трэба дабіцца поўнага выкананьня пляну ўкамплектаваньня і арганізацыі абагуленых сьвінных стад у калгасах.

Камісіі садзейнасьці павінны праверыць, наколькі сьвінаводныя калгасы забясьпечаны патрэбнымі кармамі. Вакол правядзеньня месячніка сьвінагадоўлі трэба мабілізаваць усю вясковую грамадзкасьць, арганізаваўшы сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі і паасобнымі калгасьнікамі.

Не пазьней 20 лістапада райкалгасаюзы і калгассэкцыі павінны даслаць у калгасцэнтр справаздачы аб правядзеньні месячніка сьвінагадоўлі.

Старшыня Рагачоўскага т-ва ня ведае, дзе сьвінарнікі

Рагачоўскае гарадзкое спажывецкае таварыства ўпарта не жадае выконваць дырэктыў аб арганізацыі сьвіной гаспадаркі. На адкорм покуль пастаўлена толькі 80 сьвіней, якіх трымаюць у дрэнных умовах. Сьвінарнік чамусьці пабудаваны каля самай ракі. Калі прыбывае вада, сьвінарнік затапляецца. Сьвінаматкі ўсе перакормлены.

Аб тым, наколькі таварыства цікавіцца сьвіной гаспадаркай, можа служыць наступны факт: нядаўна Рагачоў наведаў намесьнік наркамгандлю, тав. **Абрамсон.** Калі апошні пажадаў азнаёміцца са сьвіной гаспадаркай, старшыня спажывецкага таварыства **Турлай** на працягу цэлай гадзіны вазіў наркома па Рагачову і ня мог знайсьці, дзе знаходзяцца сьвінарнікі. За ўвесь час сваёй работы старшыня таварыства толькі адзін раз быў у гаспадарцы і ўжо забыўся дзе яна знаходзіцца.

Арк.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

Бярэце прыклад з лепшых

ПАВОДЛЕ ВЕСТАК ТРЭСТУ «СЬВІНАВОД», ПЛЯН УКАМПЛЕКТАВАНЬНЯ САЎГАСАЎ «СЬВІНАВОДУ» СЬВІНАМАТКАМІ ПА БССР ВЫКАНАНЫ НА 10 КАСТРЫЧНІКА Ў РАЗЬМЕРЫ 42,9 ПРОЦ.

ДА ЛІКУ САЎГАСАЎ, ЯКІЯ ІДУЦЬ НАПЕРАДЗЕ ПА ЎКАМПЛЕКТАВАНЬНІ СЬВІНАМАТАК, МЫ СЁНЬНЯ ДАДАЕМ САЎГАС **МСЬЦІЖ**, ЯКІ ВЫКАНАЎ ПЛЯН У РАЗЬМЕРЫ 149,2 ПРОЦ., У САЎГАС **ГАРОМЦЫ**—116,3 ПРОЦ. І ЛУЧЫЦЫ—101 ПРОЦ.

САЎГАСЫ **ЦЯЦЕРЫНА І КРЫВОЕ** НАБЛІЖАЮЦЦА ДА ВЫКАНАНЬНЯ ЗАДАНЬНЯ. ПЕРШЫ ВЫКАНАЎ У РАЗЬМЕРЫ 90,7 ПРОЦ., ДРУГІ — 92,7 ПРОЦ.

Кандыдаты на чорную дошку

РАД САЎГАСАЎ СЫСТЭМАТЫЧНА ЯК ВЫКОНВАЕ ПЛЯНАЎ І ГАНЕБНА ЦЯГНЕЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ. РЭКОРД ПАБІЎ САЎГАС «СТАЛІНО», ЯКІ З ВЫЗНАЧАНЫХ ДЛЯ ЯГО 1.100 СЬВІНАМАТАК ПАКУЛЬ МАЕ ТОЛЬКІ 8 (0,7 ПРОЦ.). ЯК ЛЕПШ СПРАВА І Ў САЎГАСЕ **ЗАРЭЧЧА**—ЗАМЕСТ 400 СЬВІНАМАТАК ЁСЬЦЬ ТОЛЬКІ 3 (0,8 ПРОЦ.). САЎГАС **«ВЫЗВАЛЕНЬНЕ»** ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ Ў РАЗЬМЕРЫ 5,8 ПРОЦ., САЎГАС СЛАВЯНКА — 6,4 ПРОЦ., САЎГАС НЕСЯТА — 0,7 ПРОЦ., САЎГАС ЦІМАНАВА—14,4 ПРОЦ.

Забясьпечыць будаўніцтва матар'ялямі

У сувязі з пастановай Экана і НК РСІ БССР аб забесьпячэньні будаўнічымі матар'ялямі саўгасаў «Сьвінаводу», Дзяржплян вызначыў для гэтай мэты 50.000 куб гонтаў, 3 мільёны шт. цэглы, 9.000 кбм. піламатар'ялаў і 29 тон цьвікоў.

Тэмпы сяўбы нездавальняючыя

ЯНЫ НЕ ГАРАНТУЮЦЬ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПАСЕЎНАГА ПЛЯНУ Ў ТЭРМІН

Сурова змагацца супроць самацёку

У „дні калектывізацыі і ўраджаю“ выканаць і перавыканаць плян

Прыліў МАЦНЕЕ

ПАСЁЛКІ І ВЁСКІ ЯДНАЮЦЦА Ў КАЛГАСЫ

Клімавічы, 15.

У Клімавіцкім раёне „дзень калектывізацыі і ўраджаю“ адзначаны масавым уступленьнем адзіноасобнікаў у калгасы. 15 кастрычніка 8 пасёлкаў Дамамерыцкага сельсавету, якія налічваюць 115 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, аб'ядналіся у адзін калгас, падпісалі статут с.-г. арцелі, выбралі праўленьне і прыступілі да першага калектыўнага зяблева.

У „дзень калектывізацыі і ўраджаю“ ўся вёска Куляшоўка, Хатавіцкага сельсавету, у ліку 24 гаспадарак таксама ўступіла ў калгас. Новыя калгасьнікі праводзяць калектыўнае зяблева.

Крупскі раён на самым апошнім месцы

Становішча сяўбы па раёнах БССР характарызуюць наступныя даныя. На 15 кастрычніка перавыканалі плян сяўбы **Рагачоўскі** раён (100,9 проц.), **Жлобінскі** (104,6), **Талачынскі** (107,6), **Расьнянскі** (105,4), **Шклоўскі** (101,2), **Прапойскі** (105,6), **Чырвонапольскі** (100,4), **Касьцюковіцкі** (145,8), **Сіроцінскі** (146,9), **Полацкі** (121,6).

АДСТАЮЦЬ раёны: **Халопеніцкі** (99,2 проц.), **Смалявіцкі** (96,6), **Койданаўскі** (95,2), **Самахвалавіцкі** (96 проц.), **Цэрахаўскі** (96,7), **Глускі** (97,8).

ГАНЕБНА ПРАВАЛЬВАЮЦЬ ПЛЯНЫ сяўбы: **Чэрвеньскі** раён (64,2 проц.), **Любаньскі** (67,4), **Крупскі** (61,3), **Бялыніцкі** (63,1), **Грэскі** (71,3), **Чачэвіцкі** (71,3), **Старадароскі** (73,5).

Зводка НКЗ БССР

АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ НА 15 КАСТРЫЧНІКА.

СЭКТАРЫ	ПШАНІЦА			ЖЫТА			УСЯГО			Было на 10-X у проц.
	План	Засяна	Проц. выканн.	План	Засяна	Проц. выкан.	План	Засяна	Проц. выканн.	
Калгасы	9.248	5.556	60	176.179	144.101	81.7	185.427	149.657	80,7	77,1
Адзіноасобныя гасп.	39.401	24.608	62,4	1.187.024	1092010	91,9	1226425	1116618	91,0	89,3
РАЗАМ	48.649	30.164	62	1.363,203	1236111	90,6	1411852	1266275	89,7	87.8

Заўвага: На 15-X даў весткі 71 раён. Па астатніх раёнах у зводку ўключаны даныя па 10-X.

ЗРУХ—НЕ ПЕРАМОГА

Уборка бульбы да замаразкаў не забясьпечана

Рачны транспарт ігнаруе бульбаперавозкі

КАЛГАСЫ ХОЦІМСКАГА РАЁНУ ПЕРШЫМІ Ў БССР СКОНЧЫЛІ ЎБОРКУ БУЛЬБЫ

Павысіць тэмп!

Учора пры ЦКК РСІ БССР адбылася спэцыяльная нарада зацікаўленых арганізацый па пытаньні аб ходзе ўборкі і адгрузкі бульбы.

Паводле даных раёнаў, у калгасах на 15 кастрычніка ўбрана каля 60 проц. бульбы. За пяцідзёнку выкананa прыблізна 23 проц. усяго пляну.

Па саўгасах Белсельтрэсту ўбрана каля 50 проц. бульбы, а па саўгасах Насентрэсту—каля 60 проц.

Апошняя пяцідзёнка, такім чынам, параўнальна з папярэднімі, паказвае павялічэньне тэмпаў уборкі і пэўны зрух. Было-б няправільным, аднак, лічыць, што гэты пералом гарантуе поўнае і своячасовае выкананьне пляну ўборкі бульбы. Зрух, які паказвае апошняя пяцідзёнка, выразна сьведчыць, чаго можна дасягнуць, калі разгарнуць сапраўды энэргічную работу. Аднак, тэмп уборкі ў бягучай пяцідзёнцы павінен быць яшчэ больш павялічаны, каб скончыць уборку да наступленьня марозаў, якіх можна чакаць у дваццатых лічбах кастрычніка. Між тым калгасная маса ва многіх калгасах усё яшчэ не прыцягнута да ўборкі бульбы. У лепшым выпадку ўборкай займаюцца жанчыны-калгасьніцы, мужчынская-ж сіла ня выкарыстоўваецца. У значнай частцы раёнаў адзіноасобнік ня ўцягнуты на дапамогу калгасу.

Усё гэта гаворыць аб тым, што асноўныя мерапрыемствы, вызначаныя ў спэцыяльнай пастанове ЭКАНА БССР, на мясцох ня выконваюцца. Так, напрыклад, фонд прамтавараў для прэміраваньня рабочай сілы, якая дапамагае ўбраць бульбу ў саўгасах і калгасах, павінен быў быць вылучаны яшчэ ў кастрычніку. На нарадзе выявілася, што фонд гэты вылучаны толькі на паперы і што тавары на месцы не прасунуты. У некаторых раёнах прэміруюць... гальштукатрымацелямі і парфумаю. Маса адзіноасобнікаў паогул нічога ня ведае аб гэтым фондзе.

Значная колькасьць рабочых брыгад, якая працуе па ўборцы бульбы, выкарыстоўваецца нерацыянальна. Работа часта ідзе самацёкам. Пры большай арганізаванасьці і зацікаўленасьці кіраўніцтва калгасаў, шматлікія рабочыя брыгады маглі-б зрабіць значна больш, чым яны робяць.

У сувязі з агульным зрухам і сонечным надвор'ем, калгасная сыстэма паслабіла націск на нізоўку лічачы, што зараз ужо асабліва непакоіцца няма чаго. Між тым, арганізацыйна-масавая работа якраз цяпер павінна была быць максімальна ўзмоцнена, бо сонечнае надвор'е зьяўляецца адзінакай хуткага наступленьня замаразкаў.

Зусім невыстарчальны тэмп загатоўкі і адгрузкі бульбы. Нашае разнабой, няўзгодненасьць паміж паасобнымі загатоўцамі. Тэхнічная бульба са значнай колькасьці месц адгружаецца ў пралетарскія цэнтры для спажываньня, а сталовая бульба ідзе для пераапрацоўкі на бровар і крухмальні. Ужо адзначаны выпадкі сустрэчных перавозак бульбы. Тэмп загатоўкі бульбы для прамысловасьці недапушчальна нізкі і не перавышае 10 проц. пляну.

У апошні час паленшылася становішча з перавозкай бульбы па чыгунцы. Транспартыроўка-ж яе па вадзе ўсё яшчэ не наладжана. З месц паведамляюць аб недапушчальных адносінах кіраўніцтва Дняпроўскага параходства. На прыстанёх прытокаў Дняпра скапілася каля 10.000 тон бульбы, але яна ня можа быць адпраўлена, бо не даецца тапаж. У Жлобіне адзначаны проста шкодніцкі факт. Прыбыўшая з Кіева баржа за збожжам, адмовілася ўзяць бульбу і паплыла ўніз па Дняпры парожняй. Баржа магла ўзяць 1.000 тон бульбы. Наколькі абураючыя адносіны праяўляе рачны транспарт, сьведчыць тое, што крытыя баржы прадастаўляюцца пад нагрузку дроў, а адкрытыя—пад бульбу.

На гэтай-жа нарадзе было закранута пытаньне аб становішчы з уборкай і загатоўкай сена. Выявілася, што дзесяткі тысяч га сенажаці ў саўгасах і калгасах яшчэ ня ўбраны і ніякіх мер у гэтым напрамку ня ўжываецца. Што-ж да тычыць сеназагатовак, дык плян выкананы толькі на некалькі процантаў. Гэта справа зусім выпала з-пад увагі загатоўчых арганізацый. Плян не даведзены яшчэ да кулака-заможнага двара.

Матар'ял нарады будзе тэрмінова разгледжаны ЦКК РСІ для адпаведнага рэагаваньня.

НАПЕРАДЗЕ

Паводле даных Наркамзему аб ходзе ўборкі бульбы на 15-га кастрычніка, КАЛГАСЫ ХОЦІМСКАГА РАЁНУ ПЕРШЫМІ Ў БССР СКОНЧЫЛІ ЎБОРКУ. НАПЕРАДЗЕ: БУЛЬСКІ РАЁН — ВЫКАНАЎ 94,5 ПРОЦ. ПЛЯНУ, ПОЛАЦКІ — 90,4 ПРОЦ. ПЛЯНУ, ЛЕПЕЛЬСКІ — 88,7 ПРОЦ., ЖУРАВІЦКІ —87 ПРОЦ., ПАРЫЦКІ — 87 ПРОЦ.

Плятуцца ў хвасьце

Ва ўборцы бульбы моцна адстаюць наступныя раёны: Аршанскі — выканаў на 15 кастрычніка 39,6 проц. пляну, Заслаўскі — 24,5 проц. пляну, Мсьціслаўскі — 17,3 проц., Самахвалаўскі — 36,3 проц., Койданаўскі — 38,2 проц., Лупалаўскі — 38,1 проц., Шклоўскі — 45,5 проц., Капыльскі — 47,5 проц., Крычаўскі — 39,5 проц., Прапойскі — 42,9 проц., Чырвонапольскі — 43,6 проц., Веткаўскі — 27,1 проц., Азарыцкі — 25 проц., Юравіцкі — 11,2 проц. і Нараўлянскі — 16,6 проц.

Белкалгасцэнтр разаслаў райкалгассаюзам гэтых раёнаў тэлеграму наступнага зьместу:

«Адзначаючы недапушчальнае адставаньне ва ўборцы бульбы ў калгасах вашага раёну, Белкалгасцэнтр катэгарычна патрабуе дабіцца пералому і забясьпечыць уборку бульбы поўнасьцю да 25 кастрычніка».

Асоавіяхімаўцы Бягомльшчыны паказваюць прыклад

БЯГОМЛЬ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 300 АСОАВІЯХІМАЎЦАЎ БЯГОМЛЬСКАГА РАЁНУ ВЫЙШЛІ ПАХОДАМ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ У КАЛГАСАХ ІМЯ ТАВ. ВАРОЎСКАГА І «БЕЛАРУСЬ». АСОАВІЯХІМАЎЦЫ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ. НАСТРОЙ БАДЗЁРЫ. ВЫКЛІКАЕМ НА САЦСПАБОРНІЦТВА АСОАВІЯХІМАЎЦАЎ ПЛЕШЧАНІЦКАГА РАЁНУ.

РАЙСАВЕТ АСОАВІЯХІМУ.

250 ГА ЯШЧЭ НЯ УБРАНЫ

БЫХАЎ, 15. (Па тэлеграфу). Калгасы «Згода», «Беларусь», «Чырвоны баец», імя Вайнштэйна і камуна «Пралетарская рэспубліка» скончылі ўборку бульбы. З 1120 гэкт. бульбы, у калгасах раёну засталіся яшчэ нявубранымі 250 га. Сёньня райвыканкомам выдана пастанова аб працоўнай павіннасьці па ўборцы бульбы.

РАЙШТАБ.

Фонд прэміяваньня ня вызначаны

ПЕТРЫКАЎ. (Па тэлеграфу). Белкаапсаюз да гэтага часу ня даў дырэктывы спажывецкім т-вам вылучыць фонд прэміяваньня рабочай сілы, якая дапамагае капаць бульбу ў саўгасах і калгасах.

Райштаб АНІСЬЕЎ.

БЮЛЕТЭНЬ № 10

Становішча на пасеўным фронце характарызуецца наступнымі даными. Саўгасы БССР да «дня калектывізацыі і ўраджаю» выканалі плян сяўбы з частковым **перавышэньнем.** Аднак, ня гледзячы на агульнае выкананьне пляну, 13 саўгасаў Белсаўгастрэсту поўнасьцю пасеўнага пляну **ня выканалі,** скараціўшы азімы клін на 443 гэкт. На калгасах і індывідуальным сэктары плян сяўбы на 15 кастрычніка **выкананы на 89,7 проц.** Тэмпы сяўбы за мінулую пяцідзёнку даюць зусім **невыстарчальнае і нездавальняючае павялічэньне** (па 1,9 проц.), што ставіць над **сур'ёзную пагрозу своячасовае 100 проц. выкананьне пасеўнага пляну.** Значная частка раёнаў, дабіўшыся 90-95 проц. пасеўнага пляну, недапушчальна зьнізіла тэмпы сяўбы. У радзе раёнаў зарэгістраваны факты, калі асобныя калгасы па сёнешні дзень зусім спынілі асеньнюю сяўбу, выканаўшы пасеўны **плян на 50-60 проц. (Капыльскі** раён, калгасы «Чырвоны Кастрычнік» і інш.).

Недапушчальна адстаюць, ставячы пад удар пасеўны плян, **Чэрвеньскі, Бялыніцкі, Чачэвіцкі, Старадароскі, Крупскі, Любаньскі і Грэскі** раёны, якія выканалі па 15 кастрычніка плян сяўбы толькі на 60-70 проц. Патрэбен належны і рашучы пералом у ходзе сяўбы. У бліжэйшыя дні адстаючыя раёны павінны поўнасьцю ліквідаваць свае ганебныя прарывы і забясьпечыць своячасовае і 100 проц. выкананьне пасеўнага пляну.

У ходзе будаўніцтва і ўкамплектаваньня сьвінагадоўчых і жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў патрэбны пералом **не наступіў.** На 10 кастрычніка плян укамплекатваньня саўгасаў «Сьвінаводу» выкананы ўсяго толькі на **42 проц.**

Зрух, дасягнуты ва ўборцы бульбы, усё яшчэ не забясьпечвае своячасовага выкананьня і сканчэньня ўборачных работ.

V зьезд кампартыі Польшчы*)

Ю. Ленскі

У другой палове верасьня адбыўся 5 зьезд кампартыі Польшчы. Ён мае вялізарнае значэньне для рэвалюцыйнага руху Польшчы, уступіўшага ў пэрыяд пералому і клясавых зрухаў, за якімі пасьледуюць рашаючыя бойкі за ўладу.

Гострыя эканамічны крызіс, шпаркае нарастаньне элемэнтаў агульнапалітычнага крызісу, паскораны працэс разлажэньня ў фашысцкім лягеры патрабавалі ад зьезду грунтоўнай ацэнкі, яснай пэрспэктывы і выразных тактычных указаньняў.

У зьезд аказаўся на вышыні гэтых патрабаваньняў.

Ужо самы склад зьезду—пераважна рабочыя, загартаваны ў барацьбе і турмах — сьведчыў аб сур'ёзным баявым вопыце, які знайшоў сваё адлюстраваньне ў зьездавай дыскусіі.

На зьезьдзе былі прадстаўнікі амаль усіх мясцовых арганізацый; прычым, большасьць 2/3 дэлегатаў была абрана акруговымі канфэрэнцыямі, у якіх удзельнічала 130 таварышоў, астатнія дэлегаты абраны на акруговых нарадах.

Двухтыднёвая работа зьезду дала грунтоўны адказ на ўсе асноўныя пытаньні рэвалюцыйнага руху і галоўныя бялячкі партыі.

У ацэнцы сытуацыі зьезд адзначыў асаблівую вострасьць эканамічнага крызісу ў Польшчы з прычыны перажыткаў фэадалізму, зямельнага голаду, вялікай галечы сялянскіх мас, кабальнай запазычанасьці, вельмі вялікіх падаткаў на мілітарызм і на разбухлы апарат фашысцкай дыктатуры.

Паставіўшы належным чынам пытаньне **аб выйсьці з крызісу**, зьезд падкрэсьліў, што цяперашні крызіс значна глыбейшы, становішча польскай буржуазіі—больш цяжкое, чым у 1925-26 г. —пэнэрэдадні майскага перавароту. **Сусьветны эканамічны крызіс усё мацней ударае** па Польшчы, як на адным з найбольш слабых зьвеньняў міжнароднага капіталізму. Шансы атрымаць патрэбную дапамогу ад замежнага капіталу зьменшыліся. Фашысцкая дыктатура, якая павінна была ўзмацніць клясавае нанаваньне польскай буржуазіі, моцна пахіснулася. Вопыт мас, ужо некалькі раз яшчэ больш прыгнечаных і ашуканых на гістарычных паваротах, павялічыўся. Узмоцніўся таксама ўплыў сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе.

Рабочыя масы пачынаюць ламаць перашкоды, якія ставіць фашызм і сацыял-фашызм. Амаль кожная дэманстрацыя і кожная забастоўка рабочых перарастае ў крывавую бойку з паліцыяй. Даволі ўспомнуць, што **за апошні год у 70 гарадох польская буржуазія ўзброіла сілай разганіла беспрацоўных.** Моцна ўзварушыліся таксама нізы сацыял-фашысцкіх партый, аб чым сьведчаць забастоўная манэўры іх правадыроў, якія прабуюць ашуладаць настроі мас, каб не дапусьціць да шырокай забастовачнай хвалі.

Глыбокая нездаволенасьць у сялянскіх масах вядзе да надзвычай баявых выступленьняў на глебе падаткаў і фашысцкага зямлеўпарадкаваньня. Расьце актыўнае супраціўленьне сялян падатковым экзэкуцыям. Усё часьцей ужываюцца удушлівыя газы супроць «бунтоўных вёсак».

У нацыянал - вызваленчым руху выдзяляюцца элемэнты грамадзянскай вайны. Зарава пажараў на Заходняй Украіне — дзе галодны селянін і рабочы, удзячы прыгнечаны і эксплёатаваны, спальвае маёнткі памешчыкаў, населяючы асаднікаў і падатковыя ўстановы — гаворыць аб гэраічным змаганьні на жыцьцё і сьмерць з польскім імпэрыялізмам. З гэтым рухам ня можа ўжо справіцца паліцыя. Фашысцкі ўрад вымушаны зварачацца за дапамогай да армії, стралковых і інш. атрадаў. Тысячы паліцэйскіх і пазнанскіх уладаў пад выглядам «экспэдыцыйных калён», акружаюць украінскія вёскі, зьбіваючы непаворных сялян. Агнём і мячом наладжвае польскі імпэрыялізм «парадак» на заграбленых украінскіх землях.

Вялізарны **рэвалюцыйны ўздым у масах супадае з узрастаючым разваралам у лягеры фашызму, які разьдзіраецца ўнутраным змаганьнем паміж яго асобнымі фракцыямі з-за «мэтадаў перамогі крызісу».** Гэта змаганьне адлюстроўвае неадваротнае шырокіх пластоў дробнай і часьці сярэдняй буржуазіі, якая руйнуецца крызісам, а таксама **перагрупоўку сіл у фашысцкім лягеры—паміж санацыяй, цэнтралізмам і нацыянал-дэмакратыяй.** Зьезд падкрэсьліў, што спрычыні і нелады паміж імі, хаця бы надзвычай абвостраныя, застаюцца ў межах прынцыповай агульнай клясавай асновы. **Справа ідзе аб найбольш пасьляховым ажыцьцяўленьні праграмы ўсёй буржуазіі разгрому рэвалюцыйнага руху, перакідкі ўсіх цяжкасьцяй крызісу на плечы працоўных і падрыхтоўкі вайны супроць СССР.**

Папярэджваючы партыю перад адраджэньнем правых дэмакратычных ілюзій, асабліва небясьпечных у пэрыяд хуткага нарастаньня рэвалюцыйнай сытуацыі, зьезд **акрэсьліў выразную пэрспэктыву пралетарскай рэвалюцыі і асноўныя моманты яе праграмы ў Польшчы.** Польскі пралетарыят можа раней, чым пралетарыят іншых краёў, урвацьці ў палацу непасрэднага змаганьня за ўладу.

У гэтых умовах надзвычай узрастае роля кампартыі, якая павінна памятаць, што пералом, які адбываецца ў шырокіх масах у бок рашучага самаадданага змаганьня, ня ідзе па простай лініі і што разьмеры хістаньняў у масах залежаць мерні за ўсё ад ае мабілізацыйных здольнасьцяй і ўменьня выкрываць на жывых прыкладах сацыял-фашысцкіх шарлатанаў.

Цяпер справа ідзе, гаворачы словамі тав. Сталіна, ужо ня толькі аб тым, «каб авангард усьвядоміў немагчымасьць захаваньня старых парадкаў і няўхільнасьць іх зьвяржэньня. Справа ідзе аб тым, каб масы, мільённыя масы зразумелі гэту няўхільнасьць і праявілі гатоўнасьць падтрымаць авангард. Але зразумець гэта могуць толькі шляхам уласнага вопыту. Даць мільённым масам магчымасьць адчуць на сваім уласным вопыце няўхільнасьць зьвяржэньня старой улады, высунуць такія спосабы змаганьня і такія формы арганізацыі, якія бы палегчылі масам на вопыце ўбачыць правільнасьць рэвалюцыйных дэзынгаў,—у гэтым задача». (Пытаньні ленінізму, стар. 144).

Галоўным зьвяном у ланцугу задач кампартыі Польшчы зьезд паставіў **арганізацыю сілы для рэвалюцыйнага вырашэньня крызісу,** хуткую задачу рашаючай большасьці пралетарыяту і асноўных мас сялянства для сацыялістычнай рэвалюцыі. У гэтых адносінах кампартыя Польшчы ня мае доўгіх тэрмінаў. Падзеі разьвіваюцца з незвычайнай хуткасьцю.

Разварушыць шырокія масы працоўных, укараніць у іх сьвядомасьць на штодзённым вопыце дзе рэвалюцыйны выхад з крызісу, разгарнуць перад імі ў часе штодзённага змаганьня і ўвязваючы яго з вострымі патрэбамі—канкрэтную праграму савецкай улады, перамагчы дэмакратычныя ілюзіі і паралізаваць контр-рэвалюцыйную дывэрсію сацыял-фашызму — такі вузлавы пункт партыйнай тактыкі.

Адсюль неабходнасьць павялічэньня актыўнасьці партыі ў змаганьні за вострыя патрэбы мас (беспрацоўе, рацыяналізацыя, падаткі, фашысцкі тэрор і г. д.), а таксама ўмацаваньня партарганізацый у часе гэтага змаганьня. Гэта пытаньне стала выходным пунктам работы зьезду, які грунтоўна крытыкаваў усякія праяўленьні хвасьцізму, зазначыў па невыстарчальную актыўнасьць партыі, на вялізарную размычку паміж уплывам партыі і арганізацыйным ахопам, на слабасьць прыводных пасаў да мас, асабліва рэвалюцыйных прафсаюзаў, на далёка нездавальняючы стан паркладаў.

Зьезд распрацаваў рад кіруючых указаньняў па тактыцы адзінага фронту, якая цяпер больш, чым калі-небудзь, зьяўляецца магутным сродкам заваёвы большасьці рабочае клясы. Адзіны фронт зьнізу, на фабрыках, капальнях, фальварках, ужыты да кожнай акцыі, які апіраецца на сетку камітэтаў, выбраных масамі, павінен стаць восью штодзённай дзейнасьці партыі. Магчымасьць адыходу мас ад сацыял-фашысцкіх ніколі ня была такой вялікай, як цяпер, у час вызразных супярэчнасьцяй паміж іх справай і фразай, паміж настроямі змаганьня ў низох і апазыцыйнымі манэўрамі вярхоў сацыял-фашысцкіх і народніцка-фашысцкіх партый.

Тактыка адзінага фронту зьнізу павінна знайсьці шырокае прыстасаваньне ў цяперашняй выбарчай кампаніі, якой зьезд надаў ударны характар, зрабіўшы ле вагаром рэвалюцыйнай мабілізацыі мас. Зьезд вызначыў агульную ўстаноўку гэтай кампаніі, усклаўшы на партыю абавязак разгарнуць перад масамі праграму рэвалюцыйнага вырашэньня крызісу, цесна ўвязваючы яе з іх вострымі патрэбамі.

Зьезд зьвярнуў вельмі сур'ёзную ўвагу на ўзмацненьне кіруючай ролі партыі ў эканамічным змаганьні. Выходячы з пастанову V Канграсу Прафінтэрну, зьезд асабліва зьвярнуў увагу на **разьвіцьцё рэвалюцыйных прафсаюзаў і прафсаюзнай левай,** на арганізацыйны ахоп і кіраўніцтва баямі, нарастаючымі ў асноўных галінах прамысловасьці, на ўвязку гэтага змаганьня з рухам беспрацоўных і накіравальнае яе супроць фашысцкай дыктатуры.

Абвастрэньне клясавых канфліктаў на фабрыках, якія штурмуюцца паліцыяй, стварае спрыяючую глебу **для арганізацыі масавых папітычных забастовак,** забастовак салідарнасьці і пратэсту супроць тэрору, разам з вулічнымі дэманстрацыямі. Верасьнёўскія падзеі ў Варшаве (14-16-га) паказалі, што пры большай актыўнасьці камуністых можна выклікаць на дэманстрацыйную забастоўку рад ня толькі дробных, але і буйных фабрык. Усякая пасыўнасьць, усякая боязьнь перад труднасьцямі павінны быць здолены. Асноўная дырэктыва, даная зьездам—гэта шырокая арганізацыя палітычных забастовак наўкола падзей, якія жыва закранаюць масы, павялічэньне масавых дэманстрацый, ператварэньне асобных фабрычных забастовак у групавыя і акруговыя забастоўкі з агульным курсам на ўсеагульную забастоўку, **частковыя рэпэтыцыі якой ня выключаны ўжо зараз.**

Галоўныя арганізацыйныя намаганьні партыі зьезд накіраваў у бок буйных фабрык, як апорных пунктаў змаганьня супроць фашысцкай дыктатуры.

Лёзунг: «тварам да буйных фабрык» зьезд увязаў з другім лёзунгам: **«бліжэй да мільённых мас працоўнага і эксплёатаванага сялянства».** Накіраваньне базавой энэргіі сялянскіх мас у рэчышча арганізацыйнага змаганьня за зямлю без выкупа, за **рабоча-сялянскі ўрад** будзе рашаць аб перамозе пралетарскай рэвалюцыі. Змаганьне супроць усякіх падаткаў, падатковых экзэкуцый і карных экспэдыцый павінна стаць нагаром, які ўзьнімае рух сялянскіх мас на вышэйшую ступень. Ні гроша фашысцкаму ўраду голаду, бесправоўя, тэрору і вайны!—такі агульны воклі, кінуты зьездам.

Адначасова зьезд завастрыў увагу партыі на рабоце сярод с.-г. пралетарыяту, які складае ле галоўную апору ў вёсцы.

Пажнае месца ў зьездаўскай дыскусіі заняло нацыянальнае пытаньне. Зьезд даў падрабязны аналіз клясавых зрухаў у нацыянальна-вызваленчым руху, якія ідуць па лініі абвастраньня змаганьня ня толькі паміж польскай, але і слабой буржуазіяй, з аднаго боку і працоўнымі масамі прыпечаных народаў, з другога боку. Такі характар змаганьня украінскіх і беларускіх мас **супроць польскай акупацыі за самавызначэньне аж да аддзяленьня** і далучэньня да УССР і БССР. Гэта змаганьне сваім лёзам накіравана супроць «фэадэральскіх» плянаў польскага фашызму, а таксама супроць украінскага і беларускага нацыянал-фашызму. Зьезд выпрацаваў патрэбныя дырэктывы на ўмацаваньні кіраўніцтва нацыянальна - вызваленчым змаганьнем і яго ўвязкі з агульна-рэвалюцыйным рухам у Польшчы. Кампартыя Польшчы праводзіць зараз шырокую кампанію салідарнасьці з украінскімі рабочымі і сялянамі, заклікаючы працоўных да дэманстрацый і палітычных забастовак, салідар да адмаўленьня страляць і да братаньня, клеймячы фашысцкіх катаў і накіроўваючы супольны баявы фронт супроць польскага імпэрыялізму, супроць яго сацыял-фашысцкіх правадыкоў і нацыянал-фашысцкіх прыхільнікаў.

У супроцьстаўленьні антынямецкаму цкаванню зьезд падкрэсьліў баявую салідарнасьць пралетарыяту Польшчы і Нямеччыны, якіх мацней высунуты лёзунг самавызначэньня аж да аддзяленьня для Верхняй Сілезіі. Прынцып самавызначэньня павінен быць таксама ўжыты да зьмешаных у нацыянальных адносінах мясцовасьцяў Памор'я.

У цэнтры ўсіх задач партыі зьезд паставіў змаганьне супроць антысавецкіх ваенных рыхтаваньняў польскага фашызму і яго ўдзельнікаў, **у абарону сацыялістычнае бацькаўшчыны — СССР.** Зьезд канкрэтызаваў мэтады і формы гэтага змаганьня ў розных яе стадыях. Пытаньне аб тым, як папулярызаваць вялізарныя дасягненьні пяцігодкі, асабліва калектывізацыі, знайшоў сваё адлюстраваньне ва ўсіх рэзалюцыях зьезду.

У зьезд заняўся грунтоўна **пытаньнямі арганізацыі.** Ухваленыя пастановы даюць рад практычных указаньняў у абсягу арганізацыйнага будаўніцтва партыі, яе сувязі з масамі, арганізацыі пар'ячэек і ўсіх апорных пунктаў на прадпрыемствах, у абсягу сыстэмы партпрацы, выхаваньня кадраў зьнізу, масавай самаабароны, на рабоце ў арміі, нарэшце вызначаюць бальшавіцкі падыход на пытаньні узбраеньня

*) У верасьні б. г. адбыўся V зьезд КПП. Зьезд гаворыць на старонках «Звязды» артыкулам тав. Ленскага аб мінулым, рэдакцыя ж не яшчэ прыхіляцца ад у зьезду К УсеКП(б). У наступных нумарох «Звязды» будзе зьмешчана рэшта зьезда, якія матэрыялы і прыгатаваны.

мас і ўзброенага паўстаньня, прапаганда якога, як адзінага выйсьця з крызісу, пастаўлена на чале задач партыі.

Зьезд прайшоў пад знакам бальшавіцкай самакрытыкі, якая выкрыла галоўныя недахопы і памылкі партыі зьверху да нізу і стварыла аснову для рашучага павароту ў партыйнай практыцы.

У зьезд быў зьездам бальшавіцкай згуртаванасьці, дасягнутай у змаганьні на два франты, супроць правага ўхілу і правай групы, як галоўнай небясьпекі, а таксама супроць усякіх праяўленьняў левага апартунізму, сэктанцтва і марадёрства.

Паддаўшы грунтоўнай крытыцы сыстэму апартуністычных поглядаў групы Варскага і Кострэжвы, зьезд падкрэсьліў, што змаганьне з імі павінна працягвацца. Напор дробна-буржуазнай стыхіі і дэмакратычных ілюзій на партыю існуе далей. Старыя правыя погляды адраджаюцца пад новымі відамі. Абвастраньне неладзьў у фашысцкім лягеры і рэпрэсіі кіруючай групы фашызму ў адносінах да не цэнтралевых канкурэнтаў могуць выклікаць рэцыдыў тэорыі аб самастойнай ролі дробнай буржуазіі і аб'ектыўна рэвалюцыйнай ролі сацыял-фашызму. Таму зьезд падрабязьней спыніўся на характарыстыцы ўпамянутых неладоў, выступіўшы супроць іх правай пераадзенкі, супроць усякіх разнавіднасьцяй апартуністычнай установкі на трэцюю дэмакратычную сілу, г. зн. на змаганьне паміж лягерам дэмакратыі і фашызму, на «дэмакратычнае інтэрмецо» (пераходную стадыю) перад пралетарскай рэвалюцыяй. Задача кампартыі—актыўна скарыстаць сямейныя спрэчкі ў лягеры фашызму для выкрыцьця яго складаных часьцей, для расхістаньня асноў капіталістычнага ладу. Падводзячы масы да рашаючых баёў за ўладу, кампартыя павінна — па словах Леніна — умець з часам «правільна выбраць такі момант максымальнага распаду паміж усімі гэтымі апорамі «сьвяшчэннай прыватнай уласнасьці», каб рашучым наступленьнем пралетарыяту разьбіць усіх іх і завяваць палітычную ўладу».

Змаганьне супроць правых канцэпцый Варскага і Кострэжвы зьезд увязаў з усякімі праяўленьнямі апартунізму на практыцы, асабліва «плетэнне» ў хвасьце сацыял-фашызму.

Пад гураганным агнём крытыкі ўсяго зьезду і на яго цьвёрдыя патрабаваньне капітуляцыі, правая апазыцыя ў ЦК пасьля доўгага раздумваньня, пасьля далейшых манэўраў і атак на лінію партыі, пасьля няўдалых спроб шантажу ў апошні момант капітулявала, як група збанкрутаваных правадыроў без арміі. Т.т. Пруханік, Стэфанскі, Красэўскі і В. адмовіліся ад сваіх аговорак у адносінах да рэзалюцый ЦК КПП і Выканкому Камінтэрну. Зьезд прызнаў, што заявы гэтых таварышоў не даюць гарантыі сапраўднага пераходу на лінію партыі. Толькі іх грунтоўная самакрытыка і пасьлядоўнае змаганьне з поглядамі Кострэжвы і Варскага, якія ўхіліліся ад прысутнасьці на зьезьдзе, а таксама поўнае самаразбраеньне можа стварыць глебу для пераходу ад правафракцыйнай на партыйную пазыцыю.

Ідэалёгічныя дасягненьні партыі ў змаганьні на два франты дазволілі зьезду вызначыць **агульныя вехі для праграмы партыі,** як аснову для дыскусіі над праектам, які распрацоўваецца ЦК.

Рэзультаты двухтыднёвай работы зьезду будуць бясспрэчна буйнейшым фактарам павялічэньня баяздольнасьці партыі і ліквідацыі большага згуртаваньня яе радоў вакол выбранага зьездам кіраўніцтва. Партыя атрымае зброю, патрэбную ў пэрыяд хуткага насьпяваньня рэвалюцыйнай сытуацыі. Таму гэта барацьба мае вялізарнае значэньне для рабочых і іншых капіталістычных краёў.

Але было-б непрабачальнай памылкай, калі-б рэвалюцыйная прафаназыцыя захапілася першым посьпехам, які выявіўся ў пераходзе мас бэрлінскіх металістых да забастовачнай барацьбы і яе заўважыла тэй **небясьпекі,** якая патражае гэтай барацьбе, калі правадыры бэрлінскага саюзу металістых, Урых і К°, будуць мець якое небудзь значэньне ў кіраўніцтве рухам. Толькі калі гэтыя ўтончаныя здрадлікі будуць **рашучаю выключаны** з кіраўніцтва забастоўкай, можна будзе спадзявацца на яе пасьпяховае правядзеньне.

Камітэты барацьбы, зусім незалежныя ад уплыву прафбюракратаў і падлягаючыя толькі кантролю мас, павінны быць створаны на кожным прадпрыемстве. Барацьба металістых павінна шчыльнейшым чынам зьвязацца з барацьбой беспрацоўных пралетараў. Рэвалюцыйная прафаназыцыя павінна зрабіць барацьбу бэрлінскіх металістых **справай усяго бэрлінскага пралетарыяту.** Трэба мабілізаваць усю рабочую клясу ўсяе краіны на падтрыманьне пралетарскага Бэрліну. Зараз наступіў час, калі рэвалюцыйная прафаназыцыя павінна выявіць сябе, як рашаючая сіла ў рабочым руху. Для гэтага патрэбны адвага, рашучасьць у выступленьнях і воля да перамогі. Гэту волю трэба ў усёй настойлівасьці падтрымліваць у шырокіх масах. Калі гэта ўдасца, дык гэрэічная барацьба бэрлінскіх металістых будзе вытокавым момантам для рашаючых баёў нямецкае рабочае клясы супроць рэакцыі, супроць фашызму і сацыял-фашызму, супроць пляну Юнга, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне нямецкага пралетарыяту.

(«Правда»).

„СЁНЬНЯ МЫ ГАВОРЫМ МЭТАЛЯМ"

ЗАБАСТОВАЧНЫ ФРОНТ БЭРЛІНСКІХ МЭТАЛІСТЫХ ПАШЫРАЕЦЦА

Барацьба бэрлінскіх мэталістых

130.000 мэталістых пакінулі фабрыкі саюзу бэрлінскіх мэталяпрамысловцаў, на чале якога стаіць вядомы варацілка Борэіг. Яны пачалі гэрэічную забастовачную барацьбу, каб адбіць рабаўнічае наступленьне капіталістых на іх заработную плату, якое складае зьвяно ў агульным ходзе буржуазнай рэакцыі на пазыцыі рабочае клясы.

Прадаючы рабочых, рэфармісцкія **служкі капіталізму ня раз заяўлялі, што «барацьба магчыма толькі ў часе ўздыму кан'юнктуры, у часе-ж эканамічнай дэпрэсіі трэба ратаваць кан'юнктуру ад патрасеньняў. Прапагандаваць забастоўкі ў часе крызісу было-б бар'яцтвам».** Гэтыя модныя тэорыі жоўтых здрадлікаў разьбіты тым фактам, што 130.000 рабочых пакінулі выторчасьць і пачалі забастовачную барацьбу. Яшчэ некалькі тыдняў пазад прафсаюзныя бюракраты з гонарам залуляялі, што рэвалюцыйная прафаназыцыя ня ўдасца панесьці за сабой мэталістых. Тое, што ім удалася перашкодзіць забастоўцы ў радзе прадпрыемстваў, выклікала нават пакаторы спад настрою ў колах рэвалюцыйнай прафаназыцыі. Але зараз ясна, што рабочыя масы гатовы да барацьбы пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафаназыцыі і будуць пад гэтым кіраўніцтвам змагацца.

Наступленьне прадпрыемцаў, патрабаваўшых зьніжэньня заработнае платы на 15 проц., выклікала глыбокае абурэньне ў масах.

Прадпрыемцы не адважыліся-б выступіць так нахабна са сваімі патрэбамі супроць рабочых, калі-б яны ня ведалі, што **ім забясьпечана здрадніцтва рабочых інтарэсаў сацыял-фашыстымі.** Яны да апошніх мінутаў спадзяваліся, што амстэрдамцы паставяць застаўкі і затрымаюць шквал рабочага забастовачнага руху. І калі прафбюракратам гэта не ўдалося, дык толькі таму, што работа рэвалюцыйнай прафаназыцыі ў папярэдніх месяцы ня была бясспрэчнай. Шматлікія дробныя забастоўкі, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафаназыцыі і, перш за ўсё, баі ў Мансфэльдзе і Руры падрыхтавалі грасьбу для бэрлінскіх баёў, якія разгортваюцца.

Угаворы Ўрыха па гэты раз не дапамагалі. Рабочыя цьвёрда вядуць, што прафбюракраты адмовіліся ад правядзеньня ў жыцьцё іх патрабаваньняў аб 40-гадзінным тыдні, яны ўласнымі вушамі чулі, што Ўрых не жадае змагацца, а зьбіраецца пасьці перагаворы, але... за большае скарачэньне зарплаты, чым гэта прадугледжана «трацейскай пастановай». Апрача таго, яны таксама даведаліся, што **сацыял-дэмакратыя ўхваліла пастанову падтрымліваць** [illegible] ў Бэрліне.

Дзьве акалічнасьці, акрамя ўзрастаючага рэвалюцыйнага абурэньня пралетарыяту ў часе папярэдняй падрыхтоўчай работы рэвалюцыйнай прафаназыцыі, дапамагалі ёй, ня гледзячы на вельмі цяжкую абстаноўку буржуазнага тэрору, павесьці масы на барацьбу. Першая — гэта **вялікая перамога камуністых 14 верасьня,** зрабіўшая кампартыю самай магутнай партыяй у Бэрліне і рашаючай партыяй у 10-ці рабочых раёнах. Другая акалічнасьць — гэта пастанова V канграсу Прафінтэрну, якая раіць нямецкім рэвалюцыйным рабочым рашуча прыступіць **да стварэньня самастойнага апарату для кіраўніцтва эканамічнай барацьбой,** якое было спаткана з энтузіязмам бэрлінскімі рэвалюцыйнымі рабочымі.

Забастоўка бэрлінскіх металістых накіравана ня толькі супроць Форда, Сіманса ды інш. акул капіталу. **Яна накіравана супроць усяе сыстэмы Брунінга,** супроць здрадніцкай палітыкі **сацыял-фашыстых,** супроць **імкненьня буржуазіі на насьцях рабочае клясы будаваць новы фундамэнт для ратаваньня капіталістычнай сыстэмы.** Гэта барацьба няўхільна прыводзе да далейшага абвастрэньня крызісу нямецкага капіталізму. Яна зьвяжацца ня толькі аднакай пагыбелдзенна клясавых супярэчнасьцяй, але і **набліжэньнем непасрэднай рэвалюцыйнай сытуацыі.** Таму гэта барацьба мае вялізарнае значэньне для рабочых і іншых капіталістычных краёў.

Але было-б непрабачальнай памылкай, калі-б рэвалюцыйная прафаназыцыя захапілася першымі посьпехам, які выявіўся ў пераходзе мас бэрлінскіх металістых да забастовачнай барацьбы і яе заўважыла тэй **небясьпекі,** якая патражае гэтай барацьбе, калі правадыры бэрлінскага саюзу металістых, Урых і К°, будуць мець якое небудзь значэньне ў кіраўніцтве рухам. Толькі калі гэтыя ўтончаныя здрадлікі будуць **рашучаю выключаны** з кіраўніцтва забастоўкай, можна будзе спадзявацца на яе пасьпяховае правядзеньне.

Камітэты барацьбы, зусім незалежныя ад уплыву прафбюракратаў і падлягаючыя толькі кантролю мас, павінны быць створаны на кожным прадпрыемстве. Барацьба металістых павінна шчыльнейшым чынам зьвязацца з барацьбой беспрацоўных пралетараў. Рэвалюцыйная прафаназыцыя павінна зрабіць барацьбу бэрлінскіх металістых **справай усяго бэрлінскага пралетарыяту.** Трэба мабілізаваць усю рабочую клясу ўсяе краіны на падтрыманьне пралетарскага Бэрліну. Зараз наступіў час, калі рэвалюцыйная прафаназыцыя павінна выявіць сябе, як рашаючая сіла ў рабочым руху. Для гэтага патрэбны адвага, рашучасьць у выступленьнях і воля да перамогі. Гэту волю трэба ў усёй настойлівасьці падтрымліваць у шырокіх масах. Калі гэта ўдасца, дык гэрэічная барацьба бэрлінскіх металістых будзе вытокавым момантам для рашаючых баёў нямецкае рабочае клясы супроць рэакцыі, супроць фашызму і сацыял-фашызму, супроць пляну Юнга, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне нямецкага пралетарыяту.

(«Правда»).

У Бэрліне бастуе 130 тысяч рабочых

БЭРЛІН, 16. Паводле даных прафсаюзу металістых бастуе 130 тыс. рабочых і работніц. На працягу аднаго дня лік бастуючых павялічыўся на 4 тыс. чал.

Магутныя дэманстрацыі ў Вэдынгу і Нэй-Кёльне

ПАЛІЦЭЙСКІ ТЭРОР УЗМАЦНЯЕЦЦА

БЭРЛІН, 17. Учора а палове шостай вечарам у Бэрліне адбылася магутная дэманстрацыя бастуючых рабочых металістых, якую арганізавала рэвалюцыйная прафаназыцыя. У **Вэдынгу** (пралетарскі цэнтр Бэрліна) пачаліся сьцягацца калёны металістых з усіх раёнаў гораду. Па сканчэньні мітынгу дэманстрацыя накіравалася па вуліцах [illegible] праходзіла праз Візэнштрасэ, — піша «Ротэ Фанэ», — моцны атрад паліцэйскіх раптоўна адкрыў агонь. Адзін рабочы цяжка паранены ў калена, другому гумавай дубінкай праламаны чэрап. Потым паліцыя перайшла да пазыцыйнай вайны, паліцэйскія заляглі на перакрыжаваньнях і абстрэльвалі рад вуліц. Усе вуліцы былі ачэплены паліцыяй. Сярод рабочых панае надзвычайнае абурэньне.

У другім пралетарскім раёне Бэрліна, **у Нэйкёльне, паліцэйскія напалі на дэманстрацыю, накінулася на рабочых-аркестрантаў, сапсавалі інструменты і арыштавалі 5 рабочых. Адзін рабочы цяжка паранены ў галаву гумавай дубінкай.**

«Ротэ Фанэ» заклікае бастуючых рабочых арганізаваць сёньня сходы пратэсту супроць паліцэйскага тэрору і патрабаваць, каб была выведзена паліцыя з рабочых некалькіх заводаў выбрані рэвалюцыйныя забастовачныя камітэты. Да забастоўкі далучыліся ўсе рабочыя [illegible] (ССС).

Беларуская Акадэмія Навук павінна і будзе служыць справе сацыялістычнага будаўніцтва

Нацыянал-апартуністычнае кіраўніцтва ячэйкі КП(б)Б БАН, якое не давала адпору, патурала вылазкам контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму — распушчана

У ролі хваста нацыянал-дэмакратаў

Бюро Фрунзаўскага райкому КП(б)Б распусьціла бюро парт'ячэйкі Беларускай Акадэміі Навук. Парт'ячэйка БАН, маючы перад сабой задачу ажыцьцяўляць бальшавіцкі ўплыў на дзейнасьць і штодзённую работу Акадэміі, ня здолела справіцца з гэтай сваёй асноўнай задачай, бюро ячэйкі апынулася ў палоне бязьдзейнасьці, прымірэнча адносілася да вылазак нацыянал-дэмакратычных, контр-рэвалюцыйных элемэнтаў.

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі, уся рабочая кляса, арганізоўваючы БАН, наставіла задачу — фактам яе заснаваньня здабыць магутную цытадэль на фронце барацьбы за аўладаньне з боку пралетарыяту навукай і тэхнікай, барацьбы за пасьпяховае практычнае вырашэньне задач культурнай рэвалюцыі. Акадэмія Навук, як гэта неадноўчы падкрэсьлівалася партыяй, павінна ўсю сваю дзейнасьць і практычную работу падпарадкаваць задачам сацыялістычнага будаўніцтва, шляхам павышэньню тэмпаў індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Ці-ж падпачаліла Акадэмія сваю практычную дзейнасьць гэтай цэнтральнай задачы?

На гэта пытаньне адказ можна даць толькі адмоўны. Акадэмія Навук замест таго, каб стаць пралетарскім навуковым цэнтрам, была на справе прытулкам контр-рэвалюцыйных, нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў. Рад навуковых сіл з камуністых і беспартыйных, блізкіх да партыі людзей, ня былі запрошаны на работу ў Акадэмію, ня гледзячы на тое, што на сваёй навуковай кваліфікацыі яны былі значна вышэй за нацыянал-дэмакратычных «акадэмікаў». На рад кіруючых пастоў ў Акадэмію былі пастаўлены вядомыя нацыянал-дэмакраты, яўныя ворагі пралетарыяту, якія ў пэрыяд грамадзянскай вайны, стоячы на той бок барыкад, поплеч з інтэрвэнтамі капіталістычных краін, душылі рэвалюцыйны рух рабочых і працоўных мас сялянства Беларусі. Апынуўшыся на рабоце ў Акадэміі, нацыянал-дэмакратычныя элемэнты ўсю сваю дзейнасьць накіравалі **на служэньне і падтрыманьне капіталістычных элемэнтаў, кулака і нэпмана, унутры краіны.**

Паколькі рад камандных пасад Акадэміі апынуўся ў руках варожых пралетарыяту элемэнтаў, практычная дзейнасьць Акадэміі пераважна накіроўвалася не па тым шляху, па які паказвала партыя і які патрэбен пралетарыяту. Пераважная большасьць досьледаў і надрукаваных навуковых прац ня былі падпачалены задачам сацыялістычнага будаўніцтва. Замест яскравага клясавага аналізу гісторыі і прошлага Беларусі яны ідэалізавалі беларускую старасьвеччыну, **распаўсюджвалі** буржуазна-клерыкальныя ідэі, падводзілі тэарытычную базу пад прышчэпаўшчыну. Каму патрэбны досьледы разьвіцьця нацыянальнага мастацтва па прыкладах цэркваў, каму патрэбны тыя шматтомныя выданьні, якія нічога агульнага ня маюць з разьвіцьцём пралетарскай культуры, з разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва.

У пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы, у пэрыяд пераможнага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, калі з посьпехам ажыцьцяўляецца лёзунг партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, у сьценах БАН, дзе навічны кіроўваецца мэтады шпаркага разьвіцьця пралетарскай культуры, расквітнеў махровы нацыянал-дэмакратызм.

Дзе-ж была і чым займалася партыйная ячэйка Акадэміі?

Бюро ячэйкі ня толькі не давала адпору нацыянал-дэмакратычным, на сутнасьці контр-рэвалюцыйным вылазкам, а яўна прымірэнча да іх адносілася і ім патурала. Члены партыі, кіраўнікі Акадэміі, **Ігнатоўскі, Бялуга, Казак** ня толькі ня выкрывалі буржуазна-варожай пралетарыяту сутнасьці нацыянал-дэмакратычнай дзейнасьці «акадэмікаў», а **змыкаліся з нацыянал-дэмакратамі** і, хацелі яны гэтага ці не, **умацоўвалі пазыцыі беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму.** Скаціўшыся на справе да нацыянал-апартунізму, гэтыя члены партыі страцілі клясавае пралетарскую чуласьць і бальшавіцкую пільнасьць. Бюро партыйнай ячэйкі свайчасова ня ўжыло мер у адносінах да гэтых партыйцаў і не паставіла на прынцыповую палітычную вышыню пытаньня барацьбы за генэральную лінію партыі супроць нацыянал-апартунізму ў тэорыі і на практыцы. Партыйныя масы і блізкія да партыі беспартыйныя работнікі Акадэміі ня былі мабілізаваны на барацьбу за чыстату маркэцыка-ленінскай ідэалёгіі ў навуковай і іншай дзейнасьці Акадэміі. Нават, больш таго, бюро парт'ячэйкі дапусьціла грубейшую палітычную памылку ў адносінах да катэдры максызму-ленінізму, што дало магчымасьць нацыянал-дэмакратам узмацніць свае пазыцыі ў барацьбе супроць гэтай катэдры.

Бюро ячэйкі і кіруючыя работнікі Акадэміі — партыйцы не зьявіліся пачынальнікамі разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, у першую чаргу тых памылак, якіх так німат было ў рабоце Акадэміі. Сілу пралетарскай крытыкі бюро ячэйкі ня здолела накіраваць супроць нацыянал-дэмакратычнай дзейнасьці «акадэмікаў», якая разгортвалася ў Акадэміі, супроць тых выданьняў БАН, якія на сваім зьмесьце зьяўляюцца нацыянал-дэмакратычнымі, шкодным для савецкага будаўніцтва.

Недапушчальныя адносіны бюро парт'ячэйкі Акадэміі да важнейшых дырэктыў партыі прытуплялі бальшавіцка-клясавую пільнасьць членаў ячэйкі. У той час, калі ўся партыя, уся рабочая кляса з нябывалым энтузіязмам абмяркоўвалі адозву ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня і мабілізавалі ўсе сілы на практычнае выкананьне кожнага яе пункту, у ячэйцы Акадэміі да абмеркаваньня адозвы адносьліся бюракратычна фармальна.

Тыя мэтады і формы, праз якія пралетарыят

НОВЫ ПАЧЫН ГОМЕЛЬСКІХ ДРУКАРОЎ

Скончыўшы з посьпехам манэўры па падрыхтоўцы да ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ, ударнікі „Палесдруку“ арганізуюць вялікія вытворчыя манэўры па падрыхтоўцы да ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Забясьпечым вытворчымі манэўрамі выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу, ПАДРЫХТУЕМ ГЛЕБУ для посьпеху ўсебеларускіх манэўраў да трэцяга году пяцігодкі

«Савецкая Беларусь» пад загалоўкам «Новы пачын гомельскіх друкароў» паведамляе ва ўчарашнім нумары газэты аб апошняй пастанове парткалектыву «Палесдруку» па выкананьні аб вытворчых манэўрах.

Канстатаваўшы, што за дэкаду **пасьля манэўраў**, прадпрыемства працавала **тымі-ж тэмпамі**, што і **ў часе манэўраў**, парткалектыў пастанавіў **штаб кіраўніцтва вытворчымі манэўрамі распусьціць і функцыі яго перадаць вытворчай нарадзе.**

Далей парткалектыў абвясьціў прадпрыемства мабілізаваным **для падрыхтоўкі да вялікіх 15-дзённых манэўраў напярэдадні ўступленьня ў трэці рашаючы год пяцігодкі.** На пэрыяд падрыхтоўкі да новых манэўраў на прадпрыемстве абвешчаны конкурс па лепшы цэх, брыгаду і ўдарніка.

Падрыхтоўка да вялікіх манэўраў будзе весьціся па наступнай праграме:

Прад'яўленьне рахунку рацыяналізацыі, новы збор рабочых прапаноў над лёзунгам — ад кожнага рабочага ня менш адной прапановы. Рабочыя прапановы будуць абмеркаваны — па трупавых, цэхавых і агульна-заводскіх вытворчых парадах. Нарады склікаюцца кожныя дзесяць дзён. У тых цэхах, дзе заўважаецца прарыў, або пагроза прарыву, вытворчыя нарады склікаюцца кожныя пяць дзён.

Рэгулярна кожныя 5-10 дзён павінны склікацца тэхнічныя нарады для тэхнічнага афармленьня рабочых прапаноў.

Работа кожнага ўдарніка ўлічваецца **штодзенна**, але па ўсім прадпрыемстве складаюцца **пяцідзённыя зводкі.** У цэхах, дзе наказальнікі выпрацоўкі будуць нездавальняючымі, улік будзе рабіцца штодзённа.

За час падрыхтоўкі будзе зьвернута асаблівая ўвага на арганізацыю новых «сквозных» брыгад і ўзмацненьне старых, узмацненьне і разьвіцьцё новых форм культмасавай работы, заключэньне і прапрацоўку новага калдагавору, складаньне дадатковага сустрэчнага прамфінпляну з курсам на зьніжэньне сабекошту **да 20 проц.**

Ударнікі «Палесдруку», абмеркаваўшы праграму падрыхтоўкі да вялікіх манэўраў, **ухвалілі ле цалкам і заклікалі ўсе прадпрыемствы БССР пасьледваць іх прыкладу.**

«Савецкая Беларусь», паведамляючы аб новым пачыне гомельскіх друкароў, **зусім правільна** адзначае, што гэты пачын мае **вялізарнае значэньне.** «Новыя вытворчыя манэўры, — піша газэта, — адрозьніваюцца ад мёртвых тым, што падрыхтоўка да іх праводзіцца больш дасканала, што новыя манэўры ахапляюць шырокае кола пытаньняў, зьвязаных ня толькі з вытворчасьцю». І газэта «Савецкая Беларусь» лічыць магчымым і неабходным арганізацыю **ўсебеларускіх вытворчых манэўраў напярэдадні трэцяга году пяцігодкі.**

Адначасова газэта прапануе:

1. **Стварыць усебеларускі штаб** кіраўніцтва вытворчымі манэўрамі.
2. Неадкладна **пачаць падрыхтоўку да 15-дзённых вытворчых манэўраў.**
3. Увязаць падрыхтоўку і правядзеньне манэўраў з конкурсамі на лепшае прадпрыемства і пераходныя сьцягі ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ.

Вітаючы прапанову газэты «Савецкая Беларусь» — **арганізаваць усебеларускія вытворчыя манэўры напярэдадні трэцяга году пяцігодкі,** трэба тым ня менш адзначыць **памылку** газэты «Савецкая Беларусь», якая патрабуе **неадкладна** пачаць падрыхтоўку да гэтых манэўраў, забываючы, што **значная частка прадпрыемстваў БССР праводзіць зараз, або зьбіраецца яшчэ правесьці вытворчыя манэўры па праверцы падрыхтоўкі да выкананьня прамфінпляну ўдарнага кварталу, да канца якога засталося яшчэ 2½ месяцы.**

Гэта патрабаваньне газэты «Савецкая Беларусь» правільна ў адносінах да тых прадпрыемстваў, **якія ўжо скончылі манэўры.** Але такіх, на жаль, толькі адно — **«Палесдрук».**

Па нашай думцы, газэта «Савецкая Беларусь» павінна пераключыцца па асьвятленьне і дапамогу прадпрыемствам, **якія манэўруюць зараз,** або арганізуюць манэўры **ў бліжэйшыя дні,** адначасова праводзячы **плянамерную падрыхтоўку да ўсебеларускіх манэўраў.**

Спрэчнай зьяўляецца прапанова газэты «Савецкая Беларусь» адносна арганізацыі ўсебеларускага штабу кіраўніцтва манэўрамі. Ня выклікае ніякага сумненьня, што кіраўніцтва манэўрамі павінна перайсьці цалкам да **прафсаюзаў,** органы якіх (начыпаючы нізавымі і канчаючы цэнтральнымі) і павінны зьявіцца штабамі кіраўніцтва манэўрам.

Трывожныя сыгналы з „Чырвонага мэталістага“

Замест 2.000 плугоў толькі 2—

вось вынік работы заводу ў першай дэкадзе

Арганізаваць вытворчыя манэўры, каб выявіць карэньні прарываў

Віцебскі завод «Чырвоны Мэталісты» скончыў другі год пяцігодкі з прарывам. Паводле пляну на ўдарны квартал кастрычнік - сьнежань завод павінен штодзенна выпускаць 200 плугоў ДТ/РМ. За першую дэкаду ўдарнага кварталу завод выпусьціў замест 2.000 плугоў **толькі 2.** У чым справа? З-за нядбайных адносін тэхнэрсаналу да сваіх абавязкаў, была дапушчана памылка. Замест жалеза для вырабу плугоў, загадчык плужным цэхам **т. Караўкін** выпісаў інструмэнтальную сталь, з якой пачалі выробліваць рэгулятары для плугоў. У першы дзень былі паламаны плансоны прасу. Штампоўшчыкі не пасьпявалі застаўляць матрыц і плансонаў таму, што сталь разьбівала іх ушчэнт. На заявы рабочых, што са сталі рэгулятараў нельга рабіць, загадчык цэхам Караўкін, адказаў: «Я адказваю. Загадана рабіць і рабеце».

Каб выйсьці са створанага становішча, пачалі штампаваць рэгулятары ў гарачым выглядзе. Ад гарачай сталі матрыцы садзіліся, як цеста. Пасьля гарачай штампоўкі рэгулятары карожыліся і іх трэба было раўняць, а такіх машын на заводзе няма. Штампавалі рэгулятары ў гарачым выглядзе да таго часу, пакуль 9-га кастрычніка пліта штампу не разьлцелася на кавалкі. Цяпер пліту адраманталі і пачалі штампаваць у халодным відзе, з-за чаго крышацца плансоны. Цьвёрдая і загартаваная сталь хутка крышыцца і ўжо ў гатовым сабраным плугу ламаецца нож ці іншая частка і ўвесь плуг ідзе ў брак.

Замест паўчага фармату і разьмеру, лемяхі выробліваць на «вока». Такія лемяхі трэба абточваць. Загартаваную сталь наждак бярэ дрэнна. Пасьля абточваньня праз два дні наждакі выходзяць са строю.

На 60-тонным эксцэнтрыкаваным прасе прымусілі штампаваць прадмет з супрацўленьнем матар'ялу у 75 тон. Калі рабочы заўважыў, што ад гэтага штампы можна паламаць, загадчык цэхам загадаў: «рабіць і не размаўляць». Зразумела, штампы зламаўся.

Адносіны пасобных адміністратараў да работы напляваецельскія. Майстар і заг. такарным цэхам прыходзяць на работу а 9 гадзіне, у той час, калі завод пачынае працаваць а 7 гадзіне. Дзьве гадзіны значная частка варштатаў **стаіць бяз працы,** не атрымаўшы нарадаў.

За апошні час значна павялічыўся брак. Ліцейны цэх дае каля 40 проц. браку. Такарны цэх таксама дае каля 18-20 проц. браку. Шмат дэталей, сабраных лябёдкі, груда жалеза—вось ужо 2 месяцы валяюцца на дварэ.

Вынаходзіцтва на заводзе не ў пашане. Ёсьць рад фактаў марынаваньня каштоўных прапаноў. Вынаходцу **Дудакова,** які даў рад каштоўных прапаноў, замест дапамогі пачынаюць цкаваць. Толькі пасьля запатрабаваньняў «Рабочай Газэты» і РСІ, вынаходцу Дудакову атрымаў прэмію і яго вынаходніцтва ажыцьцёўлена. За апошні час Дудакову унёс яшчэ адну прапанову, але не прысвоў тэхнік Караўкін (?!). На пратэсты Дудакова тэхнэрсанал не зважае ўвагі.

Ня гледзячы на шматлікія патрабаваньні рабочых адкрыць сталовую ў бараку малярнага цэху, адміністрацыя абяцала адкрыць да 20 верасьня. Яшчэ і зараз сталоўка не адкрыта. Рабочыя прымушаны есьці ў брудных цэхах сярод наждачнага пылу. Амаль кожны дзень 60-70 чал. застаюцца пасьля гудка на 10-15 мінут толькі таму, што не пасьпяваюць абедаць. Перад абедам кідаюць працу на 15-30 мінут раней гудка, сьпяшаючыся заняць чаргу ў сталовай. Адміністрацыя не зважае ніякай увагі на гэтыя недарэчнасьці.

Прафработа на заводзе пастаўлена дрэнна. За апошні час у завод улілося шмат новых рабочых. З імі ніякай культурна-выхаваўчай работы не вядзецца. Наглядаюцца з боку пасобных рабочых выпадкі рвацтва, спэкуляцыі, грубых парушэньняў працоўнай дысцыпліны. Фабком не аддае гэтаму ніякай ўвагі. Сярод рабочага калектыву ёсьць рад добрых прыкладаў сацыялістычнага гэраізму. Фабком і парткалектыў ня здолелі гэтых прыкладных рабочых паказаць так, каб на іх прыкладзе пайшоў увесь рабочы калектыў.

Завод, які за свае дасягненьні атрымаў орден Чырвонага Сьцягу, за апошні час нагорнуў сваю работу. Трэба зараз-жа мабілізаваць грамадзкую думку на ліквідацыю прарываў. Трэба рашуча перабудаваць адміністрацыйна-тэхнічны апарат. Неабходна зараз-жа разгарнуць **вытворчыя манэўры,** якія-б выкрылі ўсе недахопы, якія перашкаджаюць нармальнай рабоце заводу.

Прамфінплян ударнага кварталу павінен быць выкананы.

ДЖЭЛЮК і ПРАКАПОВІЧ.

Пакіньце сьцены габінэтаў

ЦП саюзаў не разгарнулі калдагаворнай кампаніі

Неадкладна рэалізаваць важнэйшую дырэктыву

Кіраўнік сэктару вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ т. КАМЕНШТЭЙН шчыра абураны нядбайнымі адносінамі большасьці ЦП саюзаў да калдагаворнай кампаніі. На нарадзе старшынь ЦП саюзаў, ЦСПСБ патрабаваў прадстаўленьня да 8 кастрычніка арэпрацыйных плянаў калдагаворнай кампаніі. Да сёнешняга дня пляны прадставілі толькі ТРЫ ЦП — транспартнікаў, горнарабочых і друкароў. (Гэта пеш за усё сьведчыць аб «кіраўніцтве»). Але і нязўнасьць плянаў па гэтых 3-х саюзах нічога не даводзіць: так, ЦП саюзу транспартнікаў папінна было паслаць на раёны 3-х работнікаў. З іх у тэрмін выехаў толькі адзін, двое зьбіраліся паехаць гэтымі днямі. Большасьць ЦП саюзаў ня ведае, што робіцца ў гэтай галіне на прадпрыемствах.

— **СТАНОВІШЧА ПАГРАЖАЮЧАЕ,** — заўпяе тав. Каменштэйн.

Кіраўніцтва гарпрафсаветаў нічым не адрозьнівацца ад кіраўніцтва ЦП. Віцебскі гарсавет, пасьля устраскі на прэзыдыуме ЦСПСБ, прыняў рэзалюцыю, якая характарызуе адносіны фабзаўкомаў да калдагаворнай кампаніі, як «НЯДБАЙНА-АПАРТУНІСТЫЧНА-МАРУДНЫЯ» (!).

Старшыня Аршанскага гарпрафсавету даў паказаньне заўкомам пачаць праверку калдагавораў з 15 лістапада, г. зн. тады, калі праверка павінна ўжо быць скончана.

Бабруйскі гарпрафсавет кампаніяй ня кіруе. Члены яго да прадпрыемстваў не прымацаваны. На фабрыках і заводах чакаюць кіраўніцтва.

Такі-ж малюнак амаль ва ўсіх іншых гарадох (за выключэньнем Гомелю).

Усюды—поўная адсутнасьць увязкі культмасавай работы з калдагаворнай кампаніяй. Шматтыражкі, за рэдкім выключэньнем, кампаніі амаль не асьвятляюць.

Большасьць фабзаўкомаў пераносіць пачатак кампаніі на тэрміны, больш блізкія да сьнежня. Яны лічаць, што часу ў іх яшчэ шмат.

Старшыня фабкому менскай швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» тав. Бухман на пытаньне—чаму ён марудзіць па калдагаворнай кампаніі, заўпяе:

— У нас ёсьць больш важныя пытаньні, як, напрыклад, прамфінплян і г. д.,—відавочна, не разумеючы, што калдагаворная кампанія з прамфінплянам вельмі цесна зьвязана.

Адзінае прадпрыемства ў Менску, дзе сёе-тое яшчэ робіцца, гэта—АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА. Тут, апрача растлумачальнай работы на 5-ці зьменных сходах, рабочым раздана 700 анкет з радам пытаньняў, напрыклад: яні пункт павінен быць уключаны ў калдагавор для пасьляховай барацьбы з цяжучасьцю расслы, якія пункты патрэбны для ўзмацненьня працаёмкасьці, палепшэньня якасьці прадукцыі, ажыцьцёўленьня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і рабочых прапаноў, палепшэньня грамадзкага харчаваньня і г. д. Праўда, анкета ня вычэрпвае нават асноўных пытаньняў, зьвязаных з ДВУХБАКОВАСЬЦЮ калдагавору, а некаторыя пытаньні сфармуляваны вельмі цьмяна. Але ўсё-ж САМА ПАСТАНОЎКА РАДУ ВЫТВОРЧЫХ ПЫТАНЬНЯЎ У СУВЯЗІ З ПЕРАЗАКЛЮЧЭНЬНЕМ КАЛДАГАВОРУ, сьведчыць аб правільным падыходзе абутнікаў.

Што датычыць іншых прадпрыемстваў, дык усе яны чакаюць РАШУЧАГА ШТУРШКУ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦСПСБ І СВАІХ ЦП САЮЗАЎ. Але, на жаль, ні ЦСПСБ, ні ЦП саюзаў НЕ ПРАЯЎЛЯЮЦЬ ЯШЧЭ АДПАВЕДНАЙ РАШУЧАСЬЦІ ў справе разгортваньня калдагаворнай кампаніі.

Да рэчы, ні адна менская газэта (у тым ліку і «Зьвязда») не разгарнула яшчэ асьвятленьня і арганізацыі калдагаворнай кампаніі, у адпаведнасьці з тымі задачамі, якія перад калдагаворнай кампаніяй зараз стаяць.

Фабком Магілеўскай швэйнай бязьдзейнічае

Мабілізаваць рабочую масу супроць рвачоў і сымулянтаў

Тыдні два таму назад у газэце «Камунар Магілеўшчыны» быў зьмешчаны допіс аб тым, што фабком швэйнай фабрыкі падыходзіць фармальна да калдагаворнай кампаніі. Між тым, фабком по рэагаваў на гэты артыкул і дагэтуль не разгарнуў па-ўдарнаму сваю работу.

Камісія, выпучаная фабкомам, зусім не працавала, ня гледзячы на тое, што фабрыка ўжо 7 дзён стаіць і ўсе члены гэтае камісіі ходзяць без работы. Фабком ня здолеў нават склікаць пасяджэньне камісіі.

А за гэты год было шмат парушэньняў пунктаў калдагавору як з боку адміністрацыі, так і з боку рабочых. Мы мелі вялікія прагулы, рвацтва, сымулянцтва, а фабком несвячасова складаў акт гэтых выпадкаў грамадзкую думку рабочае масы. Адміністрацыя-ж неправільна тлумачыла калдагавор, няправільна зьмяняла з работы, перакідвала і інш. Ня выкананы поўнасьцю пункт дагавору аб аховe працы і паляпшэньні быту рабочых.

Адгэтуль вынікае неабходнасьць пырока разгарнуць калдагаворную кампанію сярод магілеўскіх рабочых-швэйнікаў. Яны павінны ўнесьці зьмены ў пункты дагавору і папраўкі, на падставе вопыту мінулага году.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па рвацкіх настроях, якія нагадваюцца яшчэ сярод несьвядомай часткі рабочых. Фабкому трэба тэрмінова ліквідаваць сымулянку і на-дзелавому ўзяцца за справу, уцягнуўшы рабочых у праверку выкананьня калдагавору.

Скапец.

„Дапамога“ Іванова і Мадрыцкага

Неадкладна паслаць т. Балашова

ВЫНАХОДНІЦТВА ЎДАРНІКАЎ ПАШКЕВІЧА і ПАДОКСІКА—КАШТОЎНАЕ І МАЕ ВЯЛІЗАРНЕЙШАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ДЛЯ ЗАПАЛКАВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ. АДНОСІНЫ ДА ГЭТАГА ВЫНАХОДНІЦТВА ДАСЛАНЫХ ІНЖЫНЭРАЎ МАДРЫЦКАГА І ІВАНОВА **НЯ ВЫТРЫМЛІВАЮЦЬ НІЯКАЙ КРЫТЫКІ.** ВЫНАХОДНІЦТВА **МОЖНА АЖЫЦЬЦЁВІЦЬ** І ЯНО ПАВІННА БЫЦЬ ПРАВЕДЗЕНА Ў ЖЫЦЬЦЁ. АЛЕ ФАБРЫКА НЯ МАЕ ТЭХНІЧНЫХ СІЛ ДЛЯ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ГЭТАГА МЕРАПРЫЕМСТВА.

ТРЭБА, КАБ ВЫШЭЙШЫЯ ОРГАНЫ ПРЫСЛАЛІ АЎТАРЫТЭТНАГА ІНЖЫНЭРА - КАНСТРУКТАРА, ЯКІ Б ЗАЙНЯЎСЯ СПРАВАЙ РЭАЛІЗАЦЫІ ВЫНАХОДЗТВА, МАЯ АСАБІСТАЯ ДУМКА — НЕАБХОДНА ПРЫСЛАЦЬ СТАРОГА СПЭЦЫЯЛІСТАГА, ІНЖЫНЭРА-КАНСТРУКТАРА ЗАПАЛКАВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ **ТАВ. БАЛАШОВА,** ЯКІ ЗАРАЗ ПРАЦУЕ НА ЗАВОДЗЕ «ПРАЛЕТАРЫ» Ў ГОМЕЛІ.

ДЫРЭКТАР ФАБРЫКІ «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» і «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА»

АЛЬФІРОВІЧ.

ПАГЛЯДЗЕЛІ І ПАЕХАЛІ

У № 238 газэты «Зьвязда» мы пісалі аб вельмі каштоўным вынаходзтве двух ударнікаў фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» т. т. Пашкевіча і Падоксіка. Запалкавае аб'яднаньне камадыравала ў Барысаў сваіх 2-х інжынэраў—ІВАНОВА і МАДРЫЦКАГА на дапамогу рэалізаваць гэта вынаходзтва.

Інжынэры, замест таго, каб азнаёміцца з чарцяжамі падрабязна, пагутарыць з вынаходцамі, абмяжаваліся тым, што пахадзілі па фабрыцы, паглядзелі і паехалі.

А на разьвітаньні інжынэр ІВАНОЎ сказаў: ВЫНАХОДЗТВА ЦІКАВАЕ, АЛЕ АЖЫЦЬЦЁВІЦЬ ЯГО ВЕЛЬМІ ЦЯЖКА».

Грамадзкасьць фабрыкі вельмі абурана паводзінамі інжынэраў, якія нават НЕ ЗРАБІЛІ ІНФАРМАЦЫІ НА ВЫТВОРЧАЙ НАРАДЗЕ.

Мы патрабуем ад РСІ ўмяшаньня ў гэту справу.

Малюнак мастака Кароўскага

ПІСАРЭНКА, ПІЛІП СЬЦЯПАНАВІЧ —кіраўнік ударнай брыгады па зборцы растворамяшалак кацельнага цэху гомельскага заводу «Пралетары».

Баявых тэмпаў ня вытрымалі да канца

Бабруйскія прафарганізацыі абмяжоўваюцца цыркулярамі

Бабруйскія прафарганізацыі пачалі рыхтавацца да калдагаворнай кампаніі яшчэ ў пачатку верасьня. Узяўшы пад увагу усю важнасьць гэтай кампаніі, нізавыя прафячэйкі ўзяліся за работу, як належыць.

Райпрафсавет адразу накіраваў было ход кампаніі па правільным рэчышчы. Была склікана тады нарада старшынь фабзаўмясцкомаў і культнарада, дзе абгаварвалася падрыхтоўка да перазаключэньня калдагавораў. Пытаньні калдагаворнай кампаніі абмяркоўваліся таксама на нарадзе сакратароў парт'ячеек і фракцыі фабзаўкомаў, скліканых РК КП(б)Б.

Зараз **у паасобных нізавых ячэйках** справа ідзе даволі здавальняюча. Так, на швэйнай фабрыцы імя Дзяржынскага складзены фабрычныя ЧКК і ЧКК па асобных агрэгатах. У кожным цэху ёсьць брыгады добраахвотнікаў, якія займаюцца праверкай старога калдагавору і зьбіраюць спэцыяльныя памяткі. У брыгадах занята 120 рабочых. Фабком падрукаваў спэцыяльныя памяткі і анкеты-прапановы, разданыя ўсім рабочым. На сёнешні дзень сабрана звыш 400 прапаноў.

Прыблізна такое-ж становішча мы маем на камбінаце і на чыгунна-ліцейным заводзе імя Сталіна. Значна горш —у друкароў, на хлебапякарні ЦРК, у транспартнікаў і саўгандальслужачых і на электрастанцыі. Дарэчы, электрастанцыя зусім яшчэ не займалася падрыхтоўкаю да калдагаворнай кампаніі.

Як агульнае зьявішча трэба адзначыць—**адсутнасьць увязкі калдагаворнай кампаніі з культмасавай работай.** Моўчкі абыходзяць гэтую кампанію **шматтыражкі і насьценгазеты** прадпрыемстваў. Кіраўніцтва райпрафсавету ў калдагаворнай кампаніі адчуваецца ціпер **вельмі слаба.** Пануе цыркулярнічына, няма жывога кіраўніцтва.

С.

ЧАКАЮЦЬ 15-га СЬНЕЖНЯ...

Да апошняга часу паасобныя работнікі прафарганізацыі на пытаньне:—чаму так марудна разгортваецца праверка старых калдагавораў і падрыхтоўка да перазаключэньня новых, адказвалі:

— Пачалі мы добра, але значна перашкодзіў адтэрмінаўка да 15 сьнежня.

Вось тая «аб'ектыўная» прычына, на якую шмат у якіх месцох спасылаюцца прафработнікі для таго, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць у выкананьні дырэктыў партыі аб калдагаворнай кампаніі.

Неадарчы нарада старшынь ЦП саюзаў прыняла работу ЦП саюзаў у падрыхтоўцы да перазаключэньня калдагавораў **нездавальняючай.**

Вельмі слаба праводзіцца калдагаворная кампанія на прадпрыемствах харчовай прамысловасьці. Член прэзыдыуму ЦП саюзу харчавікоў **т. Варшаўчык** гаворыць, што ў Менску на «Чырвонай зары», «Пралетары» і хлебазаводзе ёсьць брыгады, прапановы, а якія яны і каюта пакіраваны—у ЦП ня ведаюць. Ня ведаюць прафработнікі і аб тым, што паасобныя прапановы нагадваюць рвацтва і работым не растлумачылі палітычнага значэньня калдагаворнай кампаніі.

На заводзе «Беларусь» дагэтуль і партыйныя арганізацыі нічога не зрабілі ў справе праверкі калдагавору. Гэтае пытаньне яшчэ не стаяла і на заўкоме...

А што робіцца ў раёнах?

Старшыня заўкому аршанскага хлебазаводу **т. Дубяга** гаворыць, напрыклад:

— Мы пакуль што і ня думаем аб калдагаворнай кампаніі.

Старшыня аршанскага райпрафсавету т. Дамрэдацаў даў «адпаведныя» паказаньні заўкомам—**распачаць праверку калдагавораў з 15 лістапада.**

Мала чаго ведае аб калдагаворнай кампаніі старшыня саюзу **хэмікаў т. Пранап'ева.** Яна пасылае да тэхнічнага сакратара: «ён усё ведае»

У беларускім камітэце **паперыкаў** ведаюць толькі, колькі створана ЧКК і добраахвотных брыгад на кожным прадпрыемстве, але аб канкрэтна праробленай рабоце там нічога ня ведаюць.

Паданыя факты сьведчаць, што **ў цэнтры мала ведаюць аб тым, што робіцца на прадпрыемствах.** Працаўнікі спаздяваюцца на сваю загружанасьць. Між тым, ні адно ЦП не падумала аб скарыстаньні **добраахвотнікаў** па-штатнага інструктажу, ня кінула іх на прадпрыемствы, каб азнаёміцца з тымі, як праводзяць работу па перакліканьні калдагавораў нашы заўкомы.

А. Манькоў.

Арганізуецца адзіны саюз рабочых лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці

9-га кастрычніка адбыўся аб'яднанае пасяджэньне прэзыдыуму Беларускага рэспубліканскага камітэту саюзу сельгаспрабочых і цэнтральнага праўленьня саюзу дрэваапрацоўшчыкаў, прысьвечанае пытаньню аб перадачы ўсіх лясных рабочых і спэцыялістаў у саюз дрэваапрацоўшчыкаў, на аснове пастаноў УсеЦСПС і пленуму ЦК аднаўленых саюзаў.

Аб'яднанае пасяджэньне пастанавіла да 12-га кастрычніка перадаць саюзу дрэваапрацоўшчыкаў усіх членаў саюзу сельгаспрабочых, якія працуюць у Леспрамгасе, лесрэсах, на лесасплаве, у лясох мясцовага значэньня. Усім райкомам лесапрамасаў і фабзаўкомам прапанавана правесьці шырокую растлумачальную кампанію аб арганізацыі **адзінага саюзу рабочых лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці.**

Члены прэзыдыуму Беларускага камітэту саюзу сельгаспрабочых **т. Эльпэрын і Бушко** кааптаваны ў прэзыдыум ЦП іншага саюзу.

Пры газэце «Сельгаспрабочы» будзе выдавацца лісток «Лясны рабочы».

ХТО ПА-ЗА КОНКУРСАМ НА ТРЫ ПЕРАХОДНЫЯ СЬЦЯГІ?

ЗАЎТРА

а 9 гадзіны раніцы сэктар вытворч. і зарплаты ЦСПСБ СКЛІКАЕ

ПРАДСТАЎНІКОЎ У ЖУРЫ

НА ПЫТАНЬНІ

аб ходзе кункурсу на тры пераходныя сьцягі: ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ВСНГБ.

Абавязаны зявіцца: прадстаўнікі рэдакцый газ. „Зьвязда“ і „Рабочай“, ЦК ЛКСМ, ВСНГБ і тры ударнікі, вылучаныя ад калдагаварацоўчай, гарбарнай і швэйнай прамысловасьці.

Запрашэнцца прадстаўнікі рэдакцый газэт „Савецкая Беларусь“, „Чырвонае Зьмена“ і „Акцябр“.

Загадчык сэктарам вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ КАМЕНШТЭЙН.

Аб становішчы рыбнай гаспадаркі у БССР

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Сакратарыят ЦК адзначае, што становішча рыбнай гаспадаркі і рыбалоўства ў БССР нездавальняючае. Яно далёка не адпавядае тым магчымасьцям, якія захаваны ў наліччы на тэрыторыі БССР значнай колькасьці прыгодных для рыбалоўства вадаёмаў, а таксама тым вялікім гаспадарча-палітычным задачам, якія пастаўлены перад гэтай галіной народнай гаспадаркі, асабліва ў сувязі з цяжкасьцямі рабочага забесьпячэньня. Такое становішча тлумачыцца педадрэнтнай пастаноўкай работы рыбалоўных і забесьпячальных арганізацый слабым кіраўніцтвам рыбалоўнымі арцелямі з боку савецкіх, партыйных і каапэрацыйных арганізацый, зусім слабай палітмасавай работай сярод рыбаловаў, адсутнасьцю сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце рыбалоўных арцеляў, засьмечанасьцю часткі арцеляў кулацка-заможнымі элемэнтамі.

Сакратарыят ЦК адзначае зусім незадавальняючую работу па капітальным будаўніцтве рыбнай гаспадаркі БССР.

2. Прапанаваць райкомам і фр. РВК рашуча ўзмаціць кіраўніцтва рыбалоўнымі арцелямі на мясцох, праверыць работу іх, заслухаць даклады на пасяджэньнях РК альбо РВК, накіроўваючы галоўную ўвагу на:

а) значнае пашырэньне плянаў лоўлі;

б) палепшаньне складу арцеляў праз уцягненьне ў іх камасмольцаў, батракоў і беднякоў;

в) палепшаньне снабжэньня арцеляў прамтаварамі і харчовымі прадуктамі, згодна існуючых на гэтым пытаньні дырэктыў;

г) не адрываць рыбаловаў, асабліва ў час узмоцненай лоўлі, на іншыя работы (гуж. павін., убор. камп. і інш.);

д) садзейнічаньне забесьпячэньню снасьцямі і прыладамі праз самапрамсаюзы і НКГ;

е) даручыць НКГандлю і Белрыбаксаюзу накіраваць у галоўныя рыбалоўныя пункты 5 адказных работнікаў для наладжваньня работы на мясцох;

ж) РК і РВК ужыць захады да палепшаньня і аднаўленьня рыбаводных вадаёмаў, вызначэньне і праяядзеньне праз належныя арганізацыі (Белрыбгас, Белрыбаксаюз і НКГ) капітальнага будаўніцтва, маючы на ўвазе, што для гэтае мэты вылучаюцца значныя сродкі.

3. Прапанаваць Белкалгасцэнтру, Райкомам і РВК зараз-жа разгарнуць работу па арганізацыі рыбалоўства ў калгасах, на тэрыторыі альбо паблізу якіх ёсьць прыродныя вадаёмы.

4. Прапанаваць РК, РВК і Белрыбаксаюзу разгарнуць масавую палітвыхаваўную работу сярод рыбаловаў, арганізаваць сац. спаборніцтва і ўдарніцтва ў іх рабоце, забясьпечыць 100 проц. рэалізацыі прадукцыі дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям.

5. Даручыць Саўнаркому пры зацьвярджэньні асигнаваньняў забясьпечыць рашучы зрух у разьвіцьці рыбнай гаспадаркі. СНК на працягу кастрычніка заслухаць даклад Дзяржпляну і НКГ аб капітальным будаўніцтве рыбнай гаспадаркі на падыходзячы год і вытворчы плян, прадугледзеўшы значныя работы на палепшаньні і аднаўленьні вадаёмаў, разьвядзеньні рыбных парод, якія дадуць найбольшы эфэкт у бліжэйшы тэрмін, забесьпячэньні снасьцямі і транспартаваньнем. Дзяржпляну прадугледзець сродкі для поваарганізуемага Белрыбаксаюзу.

6. Даручыць ЦКК-РСІ праверыць, наколькі адпавядае сапраўднасьці заява тав. Амбражуласа на СНК аб тым, што рыбалоўныя арцелі забясьпечаны снасьцямі, а таксама праверыць выкананьне Белсамрамсаюзам дырэктыў ЦК аб арганізацыі арцеляў на вырабе рыбалоўных снасьцяй і забесьпячэньні імі рыбаловаў.

Прапанаваць пракуратуры ў месячны тэрмін скончыць справу аб прычынах гібелі ў зімавальніках гаспадаркі «Чырвоная Зорка» гадавікоў карпа і прыцягнуць вінаватых да суровай адказнасьці.

7. Даручыць НКГандлю, Белкаапсаюзу і Белрыбе забясьпечыць поўнасьцю выкананьне дырэктыў аб забесьпячэньні рыбаловаў прамтаварамі. Белрыбе і НКГандлю ў 5-ці дзённы тэрмін устанавіць раённыя пляны ўлову і вывазу рыбы, прадугледзеўшы па кожным раёне выдомую колькасьць рыбы для мясцовага спажываньня.

Фарсаваць арганізацыю прыгарадных гаспадарак

Безадкладна ліквідаваць прарыў у агародным будаўніцтве

Перад спажывецкай каапэрацыяй паставлена баявая задача—пляхам фарсаваньня будаўніцтва прыгарадных гаспадарак стварыць уласную магутную харчовую базу.

XVI партыйны зьезд даў у гэтым напрамку каапэрацыі больш чым выразную ўстаноўку. Аднак, патрабавалася вялікая грамадзкая кампанія, каб прымусіць спажывецкую каапэрацыю адмовіцца ад сваіх мінімальных тэмпаў і прыняць такі плян будаўніцтва прыгарадных гаспадарак, які забясьпечыў-бы задавальненьне зарастаючай патрэбнасьці рабочых центраў у гародніне, малочных прадуктах і мясе.

XVI партзьезд скончыў сваю работу ў лістападзе. Пастановы зьезду, аднак, мала адбіліся на тэмпах работы Белкаапсаюзу.

Член праўленьня Белкаапсаюзу тав. **Сулькіна,** кіраўнік сэктару с.-г. прадпрыемстваў, на пытаньне, ці можна разьлічваць, што ўдасца авоёць пад агароды запраектаваныя 6.000 га, заявіла:

— *Спадзяемся выканаць... бо трэба выканаць...*

Адказ больш чым няпэўны. Зябліва можна праводзіць у Беларусі максымум яшчэ 20-25 дзён. А вось аб чым гавораць кароткія тэлеграмы з месц.

—Віцебск. Зябліва пад нагрозай зрыву. Адсутнічае цягавая і рабочая сіла. Раённыя арганізацыі адмаўляюць у дапамозе.

— Шклоў. Зямля не адведзена... Зяб не падымаецца.

— Гомель. Зямля не адведзена. Няма трактараў.

— Магілеў. З адводам зямлі дрэнна.

На мясцох праяўляюць вельмі малую ініцыятывы і разьлічваюць выключна на дапамогу з Менску. Белкаапсаюз закідваецца тэлеграмамі з патрабаваньнем трактароў. Аб мабілізацыі жывой цягавай сілы на мясцох відаць і ня думаюць. Гэтым «трактарным настроям» Белкаапсаюз, на жаль, не дае належнага адпору.

Мясцовыя арганізацыі не аказваюць каапэрацыі дапамогі ў выкананьні задач, усклаўдзеных на яе партыяй. У некаторых мясцох—Воршы, Лупалаўскім раёне і інш. каапэрацыі нават процідзейнічаюць.

Эфэктыўнасьць каапэрацыйных фэрм вельмі нізкая. Купілі карову без усякага выбару. Відаць, што была стаука, галоўным чынам, толькі на кольцасьць. Удой кароў хістаецца ад 3 да 10 літраў у суткі. Кормяць жывёлу дрэнна, а далейшыя пэрспэктывы яшчэ больш сумныя. На 20 верасьня засіласавана ўсяго 1.500 тон кармоў пры агульным пляне сіласаваньня ў 12.600 тон.

У 1931 годзе, каб забясьпечыць сацыну кармамі трэба мець зямельную плошчу ў 27.000 га, а каапэрацыя мае толькі 9.620 га. Такім чынам, не хапае амаль 17.500 га.

Брыгада ставіць перад усімі арганізацыямі БССР і шырокай рабочай грамадзкасьці пытаньне аб патрэбнасьці актыўнай дапамогі спажывецкай каапэрацыі ў выкананьні асноўнай задачы, якая стаі

За рашучую перабудову радоў пралетарскае літаратуры

Напярэдадні стварэньня Фэдэрацыі Аб'яднаньняў Савецкіх пісьменьнікаў БССР

Прыезд гасьцей — сакратара Міжнароднага Бюро Рэвалюцыйнае Літаратуры **Бэла Іпеша** і сакратара «ВОАПП'а» **А. Селіваноўскага** — значна ўскладыхнуў літаратурную грамадзкасьць Менску. Рэзка зьмяніў свой твар і Дом Пісьменьніка. Яго пакоі ў гэтыя дні забурлілі дзесяткамі людзей — пісьменьнікамі, «прыхільнікамі» і студыйцамі.

Т. т. Бэла Іпеш і А. Селіваноўскі выступалі 15 кастрычніка на нарадзе актыву БелАПП'у, 15-ж. на шырокім вечары ў Доме Пісьменьніка і 16 — на агульным сходзе Менскае філіі БелАПП'у.

Вечар у Доме Пісьменьніка набывае надзвычай вялікае значэньне ў сэнсе далейшае кансалідацыі пралетарскіх і лева-саюзьніцкіх сіл беларускае літаратуры.

На гэтым вечары ўпяршыню на ўвесь голас загаманілі нашы пісьменьнікі пра насьпеўшую неабходнасьць стварэньня адзінае Фэдэрацыі Аб'яднаньняў Савецкіх Пісьменьнікаў БССР, пра неабходнасьць шчыльнейшае сувязі пралетарскіх і рэвалюцыйна - савецкіх літаратур брацкіх рэспублік. Нарэшце, 15-Х мы мелі выступленьні некалькіх пісьменьнікаў з **«Полымя»** і **«Ўзвышша»**, у якіх яны прызнавалі вядучую ролю БелАПП'у ў савецкай літаратуры БССР і пакуль што дэкларавалі цеснае супрацоўніцтва з ім на пазыцыях мастацкага слова.

З дакладам аб становішчы і задачах міжнароднае рэвалюцыйнае літаратуры выступіў, спатканы дружнымі воплескамі прысутных, вэнгерскі пісьменьнік **Бэла Іпеш**. Ён гаварыў на нямецкай мове.

— Трэба лічыць ненармальным, — сказаў тав. Бэла Іпеш — што дагэтуль беларускія пралетарскія і рэвалюцыйныя пісьменьнікі БССР ня прымалі ўдзелу ў рабоце міжнароднага бюро рэвалюцыйнае літаратуры.

У пачатку лістапада ў Харкаве адбудзецца пленум МБРЛ. Патрэбнасьць яго скліканьня вымагаецца небясьпекаю новай імпэрыялістычнай вайны, літаратурнымі прычынамі (дыскусыяй аб творчым мэтадзе) і зьменамі абставін работы самога Бюро, а ў зьвязку з гэтым — неабходнасьцю перабудовы яго структуры.

Тав. Іпеш спыніўся далей на клясавай барацьбе ў заходня - эўрапэйскай літаратуры, у прыватнасьці — на дзейнасьці канфэрэнцыі буржуазных пісьменьнікаў «Пэнклюбу» ў Варшаве, на антысавецкім выступленьні польскага пісьменьніка Купа і на задачы сусьветнай рэвалюцыйнай літаратуры па стварэньні адзінага цэнтру абароны СССР.

Тав. **Селіваноўскі** перадаў беларускім пісьменьнікам прывітаньне ад імя ФАСП РСФСР.

— У парадак сёньняшняга дня, — адзначыў тав. Селіваноўскі, — устае пытаньне інтэрнацыянальнай сувязі ўсяе савецкае літаратуры нашае краіны. Цяпер адбываецца крызіс папутніцкае літаратуры. Адбываецца клясавая дыфэрэнцыяцыя сярод папутнікаў.

Даючы бязьлітасны адпор буржуазным тэндэнцыям правага крыла папутніцтва, нам трэба прыцягваць да шчырага супрацоўніцтва другую частку яго, адданую задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

Тав. Селіваноўскі паказаў на радзе прыкладаў непарыўную сувязь палітычнага твару пісьменьніка з яго літаратурнай прадукцыяй (растрэляны шкоднік - драматург Рубінштэйн, член «СВУ» Іўчанка і інш.).

Асаблівую ўвагу аўдыторыі тав. Селіваноўскі зьвярнуў **на заклік ударнікаў у літаратуру і арабочаньне радоў «ВОАПП'а»**.

Па дакладах Бэла Іпеша і А. Селіваноўскага выступіла некалькі таварышоў.

Тав. Некрашэвіч, між іншым, паведаміў, што **з 1 студзеня 1931 г. ў Менску будзе выходзіць «Літаратурная газэта»**, якая заклікана спрыяць разгортваньню літаратурна - палітычнай думкі, а галоўнае — выхаваньню новых кадраў.

У заключным слове старшыня сходу **тав. Ліманоўскі** вітаў прыезд на Беларусь Бела Іпеша і А. Селіваноўскага і падкрэсьліў, што грунтоўнейшай задачай зараз зьяўляецца зьбіраньне і згуртаваньне літаратурных сіл вакол выкананьня нашых задач.

У творчай дыскусіі, якая перарасла РАПП і набыла ўсесаюзнае значэньне, чуцён подых новых літаратурных боек. Будзем змагацца з новымі сіламі на Беларусі за гегемонію пралетарскае літаратуры!

ЮРКА ЛЯВОННЫ.

БДТ 1—у Віцебску

Асеньня-зімавы сэзон у Віцебску БДТ-1 пачаў амаль свячасова,—са спазьненьнем толькі на тры дні: замест 20 верасьня—23 верасьня.

Перад адкрыцьцём сэзону да працы БДТ-1 была прыцягнута ўвага пралетарскае грамадзкасьці Віцебску, у першую дэкаду верасьня, шляхам дакладаў дырэкцыі тэатру ў кіраўнічых органах гораду, на нарадах, пасяджэньнях і сходах (у Гарпрафсавеце, культпропе гаркому, на нарадзе сакратароў ячэек КСМ, на сходзе камсамольцаў абуткавай фабрыкі імя Лекерта і г. д.), а пасьля прыезду калектыву тэатру, з 10 верасьня шляхам культвылазак на прадпрыемствы гораду («Чырвоны Мэталісты», «Прафінтэрн» і інш.).

Гэтыя вылазкі адразу ўстанавілі сувязь тэатру з рабочымі масамі і забясьпечылі наведваньне тэатру арганізаваным рабочым глядачам.

Дырэкцыя, разам з культсэктарам Гарпрафсавету, паставіла мэтай, як мага шырэй скарыстаць тэатр, як барацьбіта за сацыялістычную рэканструкцыю народнае гаспадаркі, як фактар ленінскай нацыянальнай палітыкі. Адкрытыя паказы былі адхілены: толькі запоўненая на 100 проц. рабочымі відоўня здольна забясьпечыць разьвіцьцё тэатру ў належным напрамку, поўную ідэалёгічную вытрыманасьць рэпэртуару. Такім чынам, глеба для разьмеркаваньня паказаў была падрыхтавана, і «Мост» Рамановіча, які ідзе з 23 верасьня, быў замацаваны за прадпрыемствамі адразу на 12 кастрычніка, а, згодна кантрольных лічбаў тэатру, павінен ісьці па 20 кастрычніка.

29 верасьня пачалася дэкада ўдарніка: кожны дзень у тэатры ішлі ўрачыстыя сходы розных саюзаў, прысьвечаныя дню ўдарніка, і пасьля іх ставіўся «Мост». Дарэчы, фабком панчошнай фабрыкі некаторых з сваіх ударнікаў прэміяваў сэзоннымі білетамі ў БДТ-1, цяпер ужо ў тэатры адкрываецца сэктар ударнікаў таму, што за гэтым прыкладам ідуць і іншыя прадпрыемствы.

Праз тэатр за час з 23 верасьня па 1 кастрычніка ўключна прайшло 7.480 глядачоў. Пасьля «Моста» пойдзе «Міжбур'е», а пасьля яго новая віцебская пастаноўка (аб ёй ніжэй).

Тэатр прыступіў да працы над новаю п'есаю. П'еса гэта—«Лінія агня» Нікіціна, у пераапрацоўцы т. Міроўіча. П'еса трактуе аб гэраічнай барацьбе, якая разгортваецца вакол пабудовы электрастанцыі з боку пралетарскага касьцяка калектыву, па чале з партыйна-камасамольскім ядром, супроць коснасьці, дробна-уласьніцкіх інстынктаў і рвацтва адсталых вясковых груп будаўнікоў, супроць таго «ідыётызму вясковага жыцьця», які прасякае і ў значныя колы сэзоннікаў.

БДТ-1 трымае цьвёрды курс на годнасьць барацьбіта за сацыялістычную рэканструкцыю, нацыянальнага на форме і пралетарскага па зьмесьце тэатру.

Я. БАБАРЫКІН.

МЕНСК

БЮДЖЭТ ГОР. МЕНСКУ НА 1931 год

Прэзыдум Гарсавету зацьвердзіў новы бюджэт г. Менску на квартал кастрычнік — сьнежань 1930 г. і на 1931 год.

На выдаткі ў квартале кастрычнік—сьнежань 1930 г. вызначаны 4 мільёны рублёў. **На 1931 г. на выдаткі вызначаны 16.400.000 рублёў, або на 149 проц. больш, чым у мінулым годзе.**

У бюджэт унесены патрэбныя сродкі на ажыцьцяўленьне пляну ўсеагульнага навучаньня: ліквідацыю няпісьменнасьці, палітэхнізацыю школ.

На будаўніцтва і капітальныя рамонты сямігодак на 1931 год асигнавана 330.000 р. замест 60.000 у мінулым годзе. **На матар'яльную дапамогу вучням** (гарачае сьнеданьне, інтэрнат і інш.) адпушчана 35.000 рублёў замест 13.000 у мінулым годзе. Значна павялічваюцца асигнаваньні на ахову здароўя і ахматмлад. Будуць арганізаваны новыя ясьлі на 250 дзяцей.

Асигнаваны сродкі **на пабудову рабочай больніцы ў Менску** і новага корпусу пры 3-й больніцы.

Наогул па культурна - сацыяльным сэктары асигнаваньні ўзрасьлі на 2.493.000 руб. — 94 проц.

Па гаспадарча - вытворчым сэктары, замест 3.732.000 руб. у 1930 г., на 1931 год адпушчана 10.107.000 рублёў. Асаблівая ўвага зьвернута на прамысловае будаўніцтва і электрыфікацыю.

На палепшэньне быту і жыльлёвых умоў працоўных адпушчана 1.496.000 рублёў (у мінулым годзе — 675.000 р.); на пабудову фабрыкі - кухні — 100.000 рублёў. У першы раз уносіцца ў бюджэт выдаткі на пабудову і капітальны рамонт дарог прыгараднай мяжы (адпушчана 270.000 рублёў). На сканчэньне аўтаматычнай тэлефоннай станцыі асигнавана 100.000 рублёў.

Як будуць скарыстаны павільёны выстаўкі

Калегія НКЗ пастанавіла скарыстаць будынкі ўсебеларускай с.-г. выстаўкі наступным чынам:

Верхняя частка тэрыторыі выстаўкі з хлявамі для буйной рагатай жывёлы, сьвінарнікамі і стайнямі перадаецца Сьвінаводтрэсту. Будынак мэханізацыі і электрыфікацыі сельскае гаспадаркі перадаецца Інстытуту мэханізацыі сельскае гаспадаркі.

Павільён зямляробства — адводзіцца пад насенна-кантрольную станцыю. Лясны павільён, вэгетацыйны домік, павільёны масавых экспэдыцый і садоўніцтва і гародніцтва перадаюцца занальнай станцыі збожжавых і бабовых культур. Павільён агнятрывалага будаўніцтва і павільён сувязі пад—кватэры для навуковых работнікаў сьвінаводчага інстытуту.

Завод па тэхнічнай пераапрацоўцы садавіны і гародніны будзе працягваць сваю работу. Галоўны павільён будзе скарыстаны для патрэб балотнага інстытуту.

Новы расклад цягнікоў

З 15 кастрычніка ўведзены новы расклад цягнікоў. Адпраўка на Маскву паштовага цягніка—штодзенна а 14 гадз. 55 мін. Адпраўка таварна-пасажырскага цягніка да Смаленску—17 г 45 мін. штодзенна. Кур'ерскі цягнік адпраўляецца на Маскву а 21 г. 55 м. Хуткі цягнік а 23 гадзіне.

Тавара-пас. цягнік прыбывае штодзенна а 7 гадз. 50 мін. Хуткі цягнік—а 9 гадз. 38 мін. Кур'ерскі цягнік прыбывае штодзенна з Масквы ў Менск а 10 гадз. 21 мін. Паштовы цягнік—а 19 г. 06 мін.

Адпраўка на Радашковічы а 5 гадз. і а 17 гадз. 40 мін. Прыбыцьцё з Радашковіч—а 8 гадз. 30 мін. і 21 гадз. 25 мін.

Адпраўка на Негарэлае а 11 гадз. і 22 гадз. 15 мін. Прыбыцьцё з Негарэлая ў Менск—а 0 гадз. 35 мін. і а 13 гадз. 10 мін.

З лістоў рабселькораў

Пагражаючае становішча

У калгасах **Сьмілаўскага** раёну ўборка збожжа і сенажаці пад пагрозай зрыву.

У калгасе **«Аб'яднаньне»** засталося на карані 40 га сенажаці, у калгасе **«Добрая Воля»**—6 га сенажаці, 1 га сэрадэлы, 3 га травы на культывізаваным балоце, 2 га канюшыны і 4 га ўкосу; у калгасе **«Чырвоны Кастрычнік»**—50 га ўкосу.

Калгасы да гэтага часу не аддаюць ўвагі справе сіласаваньня. Асабліва дрэннае становішча з сіласаваньнем у калгасе **«Новае Жыцьцё»**, у якім ёсьць зусім спраўныя, але да гэтага часу незапоўненыя сіласныя ямы.

Між тым, у калгасе адчуваецца недахват кармоў.

Для хутчэйшага зьнішчэньня прарыву па сіласаваньні патрэбны самыя тэрміновыя меры, а вінаватых у зрыве кампаніі па сіласаваньні — трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Пят—ко.

Добра, але ня ўсюды

На калгасах Каподзішчанскага сельсавету, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» праходзіць пасьпяхова. Усе калгасьнікі падпісваюцца на пазыку. Напрыклад на калгасе «Бальшавік» патрэбна было распаўсюдзіць пазыку на 600 рублёў, але калгас заданьне перавыканаў: калгасьнікі падпісаліся на пазыку на 2 тысячы руб. калгасы таксама заданьне перавыканалі.

Дрэнна толькі тое, што справа з падпіскай на пазыку ў індывідуальным сэктары нікуды ня варта. Уся падпіска складае 35 руб., у той час, як заданьне складае 4тыс. руб.

Сельсавету і арганізацыям патрэбна больш зьвярнуць увагу на прасоўваньне пазыкі ў кожную хату сялянскага двара.

А. Л.

Адміністрацыя музтэхнікуму —слова за табой

Адміністрацыя **музычнага тэхнікуму** не падрыхтавалася да чарговага наборуслухачоў.

Рабочых і сялян, якія прыехалі з розных раёнаў БССР паступаць у тэхнікум, адміністрацыі трэба было загадзя забясьпечыць адпаведным інтэрнатам.

Рабочыя, якія ўжо два тыдні як прыехалі, дагэтуль знаходзяцца ў вельмі дрэнных умовах: сьпяць на падлозе і хварэюць. Ні партячэйка, ні камсамольская ячэйка, ні адміністрацыя — не зьвяртае на гэта ніякай увагі.

Калі яшчэ дадаць, што не зьявілася яшчэ шмат педагогаў (па клясе трамбону і кларнэту),—без якіх немагчыма праводзіць іспытаў—дык малюнак паўстае ва ўсёй сваёй прыгожасьці.

У выніку такога становішча, прыехаўшыя прымушаны накідаць тэхнікум і ехаць дамоў (паехалі ўжо каля 20 чал.).

На гэта безадкладна трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу, бо рабочыя разьяжджаюцца і застаецца непралетарскі элемэнт. Слова за адміністрацыяй тэхнікуму.

РАБКОР.

Вынікі нядбайных адносін

Самахвалаўскі РВК ужо даўно ня мае памяшканьня. Будынак для РВК будуецца каля 2-х год. Прычынамі такіх марудных тэмпаў зьяўляюцца нядбайныя адносіны з боку тэхніка **Менбуду**, якому даручана кіраваць пабудовай гэтага дому. Тэхнік месяцамі знаходзіцца ў адлучках і кіраўніцтва ўскладаў на нейкага **Рубінштэйна**, якому мала знаёма гэта справа. На пабудову выдатканая ўжо 70 тыс. руб., што роўназначна страце: двухпавярховая камяніца дала асадку і ў сьценах зьявіліся шчыліны.

РСІ павінна заняцца гэтай справай.

К. Л.

Леспрамгасы зрываюць вывазку лесу

Павялічаная праграма лесазагатовак патрабуе перабудовы работы ўсяго загатоўчага апарату

З 1929-30 гаспадарчага году лясная прамысловасьць Беларусі вышла з прарываў, нявыканаўшы заданьне па дровалесазагатоўках. Праграма па загатоўцы дроў выканана на 79,8 проц., па вывазцы дзелавой драўніны — на 89,5 проц., дроў—на 90,7 проц.

Верасень ня даў пералому ў вывазцы лесу.

У мэтах задавальненьня ўзрастаючых патрэб у драўніне і забесьпячэньня гарадоў апалам, Лесбелу на 1931 апэрацыйны год і на асобны квартал 1930 г. даны значна павялічаныя, у параўнаньні з 1929-30 г., заданьні—па загатоўцы дзелавой драўніны на 22,8 проц. і на дровах—на 20 проц.

Гэтым адказным заданьням павінны адпавядаць бальшавіцкія ўдарныя тэмпы работы ўсяго загатоўчага апарату.

Апарач поўнага выкананьня данага на кастрычнік - сьнежань заданьня, гэты квартал павінен быць скарыстаны для поўнай ліквідацыі прарыву 1929-30 году.

Зразумела, што без напружаньня ўсіх сіл паказаная задача ня будзе выканана.

Апарат Леспрамгасаў, на які ўскладаецца апэрацыйнае выкананьне гэтай задачы, ня здолеў перабудаваць сваю работу. Яскравым прыкладам гэтага зьяўляецца ход загатовак і вывазкі за першую дэкаду кастрычніка.

Загатоўкі зусім не разгорнуты, належнай колькасьці лесарубаў і возчыкаў няма. Леспрамгасы ня прымаюць належных мер, каб павялічыць іх лік. Некаторыя леспрамгасы нават і не пачалі загатовак і вывазкі, напрыклад, Нёманскі (Вузда), Менскі, Ельскі, Магілеўскі, Слуцкі, Чэрвеньскі, Полацкі, Лепельскі, Хойніцкі, а іншыя, калі і распачалі работу, дык з такімі злачыннымі тэмпамі, што выпікаў ніякіх няма. Так, у Глускім Леспрамгасе працавала толькі 20 лесарубаў і 9 возчыкаў, у Чэрыкаўскім—25 возчыкаў, Лепельскі і Плешчаніцкі ня мелі ніводнага рабочага, у той час, калі для выкананьня даных ім заданьняў патрэбны тысячы возчыкаў і лесарубаў.

У выніку такой нядбайнай работы, 24 леспрамгасамі з 36 за дэкаду загатоўлена 20.247 куб. мэтраў дзелавой драўніны і 1.856 р. м. дроў, вывезена 6.263 к. м. дзелавой і 2.751 р. м. дроў, што складае зусім мізэрны процант данага заданьня.

Свае злачынныя тэмпы леспрамгасы імкнуцца апраўдаць «аб'ектыўнымі» ўмовамі: дрэнным падвор'ем, уборкай бульбы і г. д. Яны знаходзяць шмат прычын, але толькі ня ўласную нядбайнасьць.

Пастанова ўраду БССР ад 26 верасьня 1930 г. аб давядзеньні плянаў вывазкі драўніны да кёскі і дварэ зусім не скарыстана леспрамгасамі, ня гледзячы на катэгарычныя прапановы трэсту. Выкананьне паказанай пастановы, бязумоўна, дало-б належныя посьпехі.

Характэрна, што рад леспрамгасаў, ня гледзячы на катэгарычныя прапановы Лесбелу, паваг ня прыслаў вестак аб ходзе загатоўкі і вывазкі, напр., Друцкі, Талачынскі, Віцебскі, Бешанковіцкі, Дрэтуньскі і інш. Полацкі леспрамгас паведаміў, што, у зьвязку з інвэнтарызацыяй, ён не атрымаў вестак ад вучлеспрамгасаў і таму нічога даць ня можа.

З-за нядбайных адносін месц Лесбел ня меў магчымасьці даць дакладныя весткі Саюзлеспраму, якому яны былі патрэбны для тэрміновага дакладу Саюзнаму ўраду. Нядбайныя адносіны да прысылкі вестак зрываюць належную пастаноўку ўліку, без якога немагчыма тэрмінова рэагаваньне на прарывы і адставаньні паасобных зьвеньняў лесазагатоўчага апарату.

Н. УГАРАЎ.

Беларускае аддзяленьне савецкае філярмоніі

Пры Галоўмастацтве НКА БССР арганізавана аддзяленьне дзяржаўнага канцэртнага т-ва «Савецкая філярмонія» («Софил»). Аддзяленьне мае задачай—сканцэнтраваць мастацкае музычнае абслугоўваньне рабочых клюбаў, чырвоных куткоў, калгасаў і саўгасаў, забясьпечыць рабочыя клюбы, чырвоныя куткі найбольш кваліфікаванымі артыстычнымі сіламі, праводзіць прапаганду музычнага мастацтва, знаёміць рабочых з лепшымі музычнымі творамі мінулай эпохі і сучаснасьці.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ:

— **Фрунз.** РК МОПР'у. А 7 г. увеч., у памяшк. ЦК МОПР'у адбудзецца пашыраны пленум Фрунз. РК МОПР'у сумесна з актывам раёну.

— **Пушкінск. біб-ка.** А 7 з палов. г. увеч. адбудзецца пасяджэньне бібліятэчнага савету цэнтр. біб-кі імя Пушкіна. З прычыны важнасьці пытаньняў, яўка членаў бібсавету абавязкова. Запраш. актыў чытачоў і перасоваччікі з прадпрыемстваў і ЖАКТ'аў.

— А 6 г. увеч., у памяшк. Пушкінскай біб-кі, адбудзецца агульны сход дзяцей — чытачоў цэнтр. біб-кі імя Пушкіна, па пытаньні сьвяткаваньня ў біб-цы 13 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

— **Дом Камасьветы.** А 7 гадз. увеч., пак. № 19, групавая кансультацыя для прапагандыстых рабфаку «Задачы прафсаюзаў і калдагаворная кампанія».

— **Дом Асьветы.** А 7 гадз. увеч. адбудзецца нарада партыйцаў школьнай цэх. ячэйкі. Яўка ўсіх абавязкова.

— А 7 гадз. увеч., у Доме Асьветы, для настаўнікаў г. Менску будзе працытаны даклад навуковым супрацоўнікам інстытуту мэтаду школьнай работы т. Есіпавым на тэму: «Аб ужываньні мэтаду праектаў у савецкай пэдагагічнай практыцы». Запрашаюцца жадаючыя асьветнікі.

— А 7 гадз. увеч., у памяшк. ЦП саюзу працасьветы (Дом Працы, 3-ці паверх, пак. № 13) адбудзецца пасяджэньне палітасьветсэктару ЦП разам з кіраўнікамі і членамі палітасьветных груп ГК і МК старога і новага складу. Запрашаюцца асьветнікі, жадаючыя працаваць у палітасьветным сэктары ЦП.

— **Мен. т-ва дактароў.** А 8 гадз. увеч., у памяшк. аўд. 2-й больніцы адбудзецца пасяджэньне хірургічнай сэкцыі пры Менскім т-ве дактароў: Парадак дня: 1) Дэманстрацыя хворых. 2) Даклад д-ра Ігрэра аб пухлінах мачавога пухіру. 3) Бягучыя справы. Запрашаюцца дактары г. Менску.

ЗАЎТРА:

— 19/X—30 г. а 6 з палов. г. увеч., у памяшк. **ЦКК-РСІ** (Савецкая, 55, 2-гі паверх, пак. № 9) адбудзецца **нарада рабочых засядацеляў** пры бюро скарагаў НК РСІ Бел. Яўка абавязкова.

— **Кастрычн. РК КП(б)Б** паведамляе, што камплектаваньне ВСШШ працягваецца да 20 кастрычніка. Зав. «Энэргіі», «Бальшавік», чыгунка, абутк. ф-ка і МЦРК камплектуюць школы на сваіх прадпрыемствах пад адказнасьць сакратароў калектываў. Астатнія ячэйкі ратаюць павінны накіраваць таварышоў у раённую ВСШШ па Інтэрнацыянальнай вул., № 35, 1-я сямігодка, у наступныя дні партвучобы — 18 і 19 кастрычніка, а 7 г. увеч. Адказнасьць ускладаецца пэрсанальна на сакратароў ячэек.

— **Фрунзаўская РКК.** А 6 гадз. увеч., у памяшк. РКК, адбудзецца пасяджэньне партгрупкі, на якое выклікаюцца наступныя т.т.: Лінковіч і Мінчанка (яч. галянт. ф-кі), Шварц (яч. Гарсавету), Маркава (яч. ф-кі «Беларуска»), Ланеўскі (яч. Белсельтрэсту), Пяшко (зав. «Камунар»), Шастакоўскі (яч. Белдар-трансу), Сяргееў (яч. ВСНГБ), Савановіч (курсы шофэраў), Далінэк (яч. будаўн.), Броўкін (яч. БАН), Чаркоўская (яч. працасьветы), Дыкштэйн (яч. Менбуду), Рак (яч. БПТ) і т. Юрачка.

Акрамя памянёных т.т. на пасяджэньне павінны зьявіцца сакратары партячэек.

— **Клюб навуковых працаўнікоў.** А 8 гадз. увеч. адбудзецца пасяджэньне праўленьня клюбу навуковых працаўнікоў, на якое запрашаюцца т.т.: Ленц, Эльбэрт, Пятроў, Розэнфэр-Вальфсон, Сосіс, Чарвакоў, Агееў—НДІ, Віленкін, Данільчык, Ноткін, Ваўчонак, Камінская-Паўлава, Шэмпэль і Гелер.

— А 8 гадз. увеч., у клюбе нав. прац. адбудзецца чарговая лекцыя тав. Крывіцкага «Матар'ялізм і ідэялізм». Запрашаюцца навуковыя працаўнікі г. Менску.

— **Навук. асацыяцыя дактароў.** А 8 з пал. гадз. увеч., у памяшк. цэнтр. рэнтген. ін-ту (пры 1 больн.) адбудзецца пасяджэньне рэнтгеналёгічнай сэкцыі навуковай асацыяцыі дактароў. Парадак дня: 1. Дэманстрацыя рэнтгенаграм і хворых. 2. Прырода праменьняў рэнтгена (праф. Усьпенскі). 3. Рэнтгенатэрапія язвы страўніка (д-р Багач).

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б сумесна з **ЦСПСБ** сёньня ў Доме Камасьветы (клюб імя Карла Маркса) а 6-й гадз. увечары склікае **РАЁННУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ ЎДАРНІКАЎ** з абвесткай дня:

1. вынікі 2-га году пяцігодкі, задачы рабочых раёну ў выкананьні прамфінпляну ўдарнага кварталу і падрыхтоўка прамфінпляну 3-га году пяцігодкі.
2. Судаклады аб барацьбе за прамфінплян і ліквідацыі прарываў на прадпрыемствах: «Камунар», «Кастрычнік», завод «Д. А.», друкарня БДВ.
3. Прэміраваньне асобных прадпрыемстваў раёну.

ФРК КП(б)Б і ЦСПСБ.с

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б

склікае сёньня, 18-га кастрычніка г. г., а 6 г. увеч., у клюбе Леніна (ст. Менск пас.),

ЧАРГОВЫ ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ,

З ПАРАДКАМ ДНЯ: 1) Вынікі правядзеньня мерапрыемстваў па адозьве ЦК УсеКП(б) і пераходу да выкананьня прамфінпляну кастрычнік—сьнежань. 2) Вынікі праведзенага агляду становішча беларусізацыі і інтэрнацыянальнага выхаваньня ў раёне. 3) Вынікі праведзенага агляду становішча і скарыстаньня вылучэнцаў.

На пленум, паміма членаў пленуму РК, павінны зьявіцца ў абавязковым парадку: сакратары партколектываў, партячэек, цэх'ячэек, старшыні ФЗМК—партыйцы, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў—партыйцы.

На пленум запрашаюцца таксама члены рэв. камісіі і РКК.

ЦП САЮЗУ САУГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

Сёньня, а 7 г. увеч., у памяшк. ЦП саюзу (Дом Працы, 3-ці паверх, пакой № 4)

СКЛІКАЕ

пашыраную нараду прафактыву саюзу СГС г. Менску

дзярж. і мясц. бюджэтных устаноў

па пытаньні абгаварэньня праектаваньня па ўніфікацыі зарплаты служачых бюджэтных устаноў (дакл. НКПрацы).

На нараду павінны зьявіцца ў абавязковым парадку старшыні і члены МК і добраахвотнікі дзярж. і мясц. бюджэтных устаноў. На гэту нараду таксама запрашаюцца кіраўнікі дзярж. і мясц. бюджэтных устаноў і члены саюзу.

Сёньня, у памяшканьні ленінскага габінэту Камвузу (Універсытэцкая, 27)

СКЛІКАЕЦЦА

пасяджэньне Т-ва гісторыкаў-марксыстых

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

працяг спрэчак па дакладу тав. СЭРБЭНТА аб становішчы на гістарычным фронце і нашых задачах

На пасяджэньне таксама запрашаюцца выкладчыкі гісторыі і іншыя т. т.

Праўленьне.

Згубленыя і украдзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі

Чл. біл. саюзу камунальн., мандат чл. Менгарсавету № 308 Пачэкоўскай Е. Ф. 2424-2425
Вайск. біл. Кандруцкага М. П., выд. Самахвал. РВК 2426
Каап. кн. Маркоўскага Ф. Ю., выд. Мен. прыгар. спаж. т-вам «Зямляроб» 2427
Пашп. Пільнікавай Е. Е., выд. Астр.-Гарадз. РВК 2428
Вайск. кн. № 44 Бацяноўскага С. І., выд. Астр.-Гарадз. РВК 2429
Асабов. пасьведч. Пянькевіч Л. І., выд. Негарэльск. сельсаветам 2430
Парт. біл. № 0581705 Пак-Даяй-Мо, выд. Нікалаеўск. АК УсеКП(б) 2431
Пасьведч. Трайкоўскай Г., выд. Мен. акрсабезам 2432
Вайск. біл. Шута І. І., выд. Мен. ваенкам. 2433
Вайск. біл. Васілевіча В. П., выд. Севастоп. ваенкам. 2434
Чырвонаарм. кн. Васюкевіча І. І., выд. 191 п. 2436
Вайск. кн. Лямпэрта П. Б., выд. Мен. ваенкам. 2437
Вайск. кн., выд. Мен. ваенкам. на імя Гінзбурга Д. М. 2438
Партбіл. № 1475014, выд. ДПК 2, камсам. біл. і асаб. вуч. карт., выд. Магілеўск. РК ЛКСМБ, чл. біл. саюзу СГС на імя Плешчыцара А. Ф. 2439—2441
Дзіц. наб. кн. № 15029 Казачэнка А., выд. МЦРК 2442
Чл. біл. саюзу працасьветы № 1135 Марозава А. І. 2443
Чл. біл. саюзу СГЛР № 25675 Марцінчыка С. П. 2444
Чл. біл. саюзу друкароў Мамедавай Н. І. 2445
Даведка аб выбарч. правох Явелавай Р. Р., выд. Мен. міліцыяй 2446
Пасьведч. аб сканч. мэдфаку ВДУ Уэздзін З. М. 2447
Чл. біл. саюзу друкароў Фалевіча М. Д. 2448
Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6/43803 Логінава М. І. 2449
Вайск. біл. Дубкова І. А., выд. Талачын. РВК 2450
Чл. біл. саюзу нарахарч № 4200 Перапечка Е. П. 2451
Мэтр. вып. Ігнатовіч Л. А., выд. Мен. ЗАГС'ам 2452
Дзіц. наб. кн. на імя Смаленцавых Л. І., Н. І. і Л. І., выд. МЦРК 2453
Пашп., выд. Чэрв. міліцыяй, мэтр. вып. на імя Шаклач А. І. 2454—2455
Чл. біл. саюзу працмастацтва № 1871 Белікава С. М. 2456
Пасьведч. аб адтэрм. вайск. сл., студ. пасьведч., выд. Бел. с.-г. акад. на імя Ханчына В. К. 2457—2458
Чл. біл. саюзу дрэваапрац. № 2688 Кубарава І. М. 2459
Мэтр. вып. Пякарскага Ф. Ф., выд. Мен. ЗАГС'ам 2460
Асаб. пасьведч., выд. 4 вуч. адд. сувязі МБВ ч. за № 3/д, чл. біл. саюзу чыгуначн., паявая кн., выд. Маск. спаж. т-вам «Камунар» на імя Данільчыка Р. А. 2461—2463
Мэтр. вып. Чэркашына Л. В., выд. Мен. ЗАГС'ам 2464
Вайск. кн. Панкратовіча Ф. У., выд. Мен. ваенкаматам 2465
Мэтр. вып. Веловіча Г. В., выд. Мен. ЗАГС'ам 2466
Пасьведч. аб сканч. 7-годкі Весялоўскай В. У. 2467
Вайск. біл. Вашкевіча А. М., выд. Койдан. РВК 2468
Партбіл. № 0817510, выд. Мен. АК КП(б)Б, чл. біл. саюзу тэкстыльш. № 1155313, асаб. пасьведч. № 53, выд. БМЖС на імя Патапчука А. І. 2469—2471
Вайск. кн. Шарбура Ф. Н., выд. Харк. ваенкаматам 2472
Вайск. біл. Амулава Р. Ю., выд. Бупатор. ваенкаматам 2473
Пашп. Навіцкай Г. Г., выд. Астр.-Гарадзецк. РВК 2474

Украдзен кашалёк, у ім знаходзіўся жэтон дзяржбанку за № 0025 на атрыманьне грошай па чэку БДВ на 1000 руб. на імя Ворана І. Г. Лічыць несапраўдным. Прад'яўніка гэтага №-ру просьба затрымаць і паведаміць у крымвышук.

Кіно-тэатр „Культура"
Лепшая камэдыя сэзону на злобу дня
ТРУП ДЭ-ЮРЭ
ПРА ДВА ЗАВОДЫ фільм у 1 ч. вытворч. БЕЛДЗЯРЖКІНО.
Зьвыш праграмы
ўдзень і ўвечары гастролі лепшага ілюзіяніста-трансфармата Н. СІМЭНО.
Дзённыя сэансы—а 1 г. і 2 г. 30 м. Каса—ад 12 гадз. дня.
Вячэрнія сэансы—а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал
Гэраічная аповесьць з гісторыі Чэчні
ЗЭЛІМ ХАН
Штодзенна 4 сэансы: Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО „Пралетары"
2-гі тыдзень 2-гі амэрыканскі фільм
Капітан лятаючай чарапахі (Бэль з Сінгапура).
Драма ў 8 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 6 г., 2-га—7 г. 30 м. 3-га—9 г., 4-га 10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 гадз.

Кіно „Юны піянэр"
Трука-прыгодніцкі фільм у 4-х сэрыях і 34 частках
Стэнлей у нетрах Афрыкі
1-я сэрыя „Ядзін супроць многіх" у 8 частках
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.
КАСА АДКРЫТА З 12 Г. ДНЯ,

Кіно „СПАРТАК"
З прычыны посьпеху 2-гі тыдзень
БЭЛА
Драма ў 8 част. па раману ЛЕРМАНТАВА.
Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 10 г. 45 м.
КАСА—АД 6 ГАДЗ. УВЕЧ.

Мастацкі ЦЫРК п/к І. Л. СТРАШЭВІЧА
СЁНЬНЯ
Субота, 18 кастрычніка
ПАЧ. а 8 з пал. гадз. увеч. КАСА—з 11 г. дня.

Новыя артыстыя! Новыя атракцыёны!
Тыдзень АТРАКЦЫЁННЫХ эрэлішч з удзелам уноў прыбылых арт. дзяржцырку
УПЯРШЫНЮ ЭЙФЭЛЕВА ВЕЖА З БРАСТОНС-ГРАНД пад куполам.
1-я ГАСТРОЛЬ нацыянальнага-трукіста Альфр. ГАРТВЭЛЬСА трайны амэр. турнік.
Італьянск. арт. цырку Мусіо ЭСПЭРАЛЬДО эласьтычн. і гібкасьць цела.
Балансьеры Бр. МЭРЛІС людзі паветра.
Арт. Маск. цырку М-с КЛА